Доступ да інфармацыі і падтрымкі ва ўмовах артыкула 19.16 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях

Задакументаваныя абмежаванні, прабелы ў дапамозе і рэкамендацыі для арганізацый і інстытуцый

LGBTQ+ House · Варшава · верасень 2026 г.
https://lgbtqhouse.org/article-19-16/research · DOI https://doi.org/10.5281/zenodo.22884584 · Ліцэнзія CC BY 4.0
Кантакт: office@lgbtqhouse.org

Пра дакумент. LGBTQ+ House з'яўляецца аўтарам і выдаўцом даследавання і распрацоўшчыкам індэкса Belarus LGBTQ+ Discourse Pressure Index (BLDPI), даныя якога выкарыстаны ў раздзелах 3 і 4; індэкс прыводзіцца ў апублікаванай версіі 2026.08 без перапрацоўкі.[1] Пратакол пошуку і аб'ём праверкі апісаны ў дадатку Б. Шэраг BLDPI ахоплівае перыяд па 31 жніўня 2026 г.; пошук дакументаў і публікацый завершаны 21 верасня 2026 г., асобныя спасылкі і нарматыўныя крыніцы дадаткова праверены 22 верасня. Датаваныя звесткі аб правапрымяненні аналізуюцца ў межах гэтага перыяду; паведамленні аб выпадках без раскрытых дат прыведзены асобна і не ўключаюцца ў перыядычныя падлікі. Сто дзён дзеяння нормы спаўняюцца 27 верасня 2026 г., пасля выхаду даследавання.

Рэзюмэ

Артыкул 19.16 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (далей КаАП) дзейнічае з 19 чэрвеня 2026 г. Ён прадугледжвае пакаранне за распаўсюд інфармацыі, якая, паводле ацэнкі правапрымяняльніка, накіраваная на фарміраванне ў грамадзян уяўленняў аб «прывабнасці» гомасексуальных адносін, гендарнага пераходу або бяздзетнасці. Пытанне даследавання: што за першыя месяцы дзеяння нормы адбылося з доступам ЛГБТК+ людзей у Беларусі да інфармацыі і да

[1] LGBTQ+ House, Індэкс ціску на ЛГБТК+ дыскурс у Беларусі (BLDPI): штомесячныя шэрагі PI/PDI, разбіўкі па катэгорыях крыніц і штомесячныя справаздачы, верасень 2025 – жнівень 2026, версія 2026.08 [набор даных], Zenodo, 2026, https://doi.org/10.5281/zenodo.22876522; метадалогія: https://lgbtqhouse.org/en/advocacy (дата звароту: 21.09.2026).

дапамогі, што з гэтага задакументавана, што з’яўляецца абгрунтаванай рызыкай і што застаецца невядомым.

1. **На момант увядзення нормы доступ да інфармацыі пра ЛГБТК+ людзей ужо быў істотна абмежаваны.** Па стане на 19 чэрвеня 2026 г. зарэгістраваныя ЛГБТК+ арганізацыі ў Беларусі былі ліквідаваныя; рэсурсы шасці ЛГБТК+ ініцыятыў і актывістак, чат знаёмстваў і сайты дзвюх праваабарончых арганізацый уваходзілі ў Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў паводле рашэнняў судоў; спіс забароненых друкаваных выданняў налічваў 258 найменняў, сярод якіх была ЛГБТК+ літаратура. Артыкул 19.16 уводзіць самастойную падставу адміністрацыйнай адказнасці за распаўсюджванне інфармацыі з указанай у артыкуле мэтай; у адрозненне ад рэжыму экстрэмісцкіх матэрыялаў яе прымяненне не абумоўлена папярэднім уключэннем канкрэтнага матэрыялу ў які-небудзь спіс.
2. **Норма прымяняецца; маштаб прымянення вымераць нельга.** Аб першым задакументаваным перасследзе паводле артыкула 19.16 TG House паведаміла 15 жніўня 2026 г.; 8 верасня яна паведаміла пра тры пацверджаныя ёю выпадкі, не раскрываючы характар мер і даты, і пра іншыя выпадкі, пакуль не пацверджаныя дакументальна. За май–жнівень арганізацыя атрымала 24 звароты ад ЛГБТК+ людзей, якія паведамлялі пра пераслед, пагрозы або рызыку рэпрэсій; да 8 верасня дзесяці з іх яна дапамагла выехаць; афіцыйны дакумент аб перасследзе мелі шэсць з 24. Судовых рашэнняў і агульнадаступнай афіцыйнай статыстыкі паводле артыкула 19.16 у разгледжаных адкрытых крыніцах не знойдзена.
3. **Пікі дыскурсіўнага ціску прыпалі на падпісанне закона і ўступленне нормы ў сілу, чытанні ў парламенце не далі пікаў; у красавіку пік забяспечылі каналы дзяржаўных органаў і СМІ.** У красавіку 2026 г., месяцы прыняцця закона, узважаны індэкс BLDPI вырас на 283,8 %; доля дзяржаўных органаў у ім выросла на 20,5 працэнтнага пункта, СМІ — на 16,0, доля прапагандысцкіх каналаў упала на 40,3. У маі індэкс апусціўся да мінімуму з пачатку назіранняў (822), у чэрвені, месяцы ўступлення ў сілу, паказаў другі, утрая меншы ўсплёск пераважна за кошт СМІ, у жніўні дасягнуў новага мінімуму (624). Гэта ўзгадняецца з гіпотэзай аб інфармацыйным суправаджэнні заканадаўчых змен; месячныя агрэгаты не дазваляюць устанавіць прычыны дынамікі і яе сувязь з правапрымяненнем. Індэкс вымярае інтэнсіўнасць дыскурсу ў рамцы назірання, а не бяспеку людзей, і не дазваляе меркаваць пра змяненне колькасці зваротаў па дапамогу.
4. **Зарэгістраваныя ЛГБТК+ арганізацыі ўнутры краіны ліквідаваныя, звесткі пра іншыя формы спецыялізаванай дапамогі абмежаваныя, а зварот па дапамогу звонку звязаны з прававой рызыкай.** Прававы аналіз прынятай нормы для грамадзян апублікавалі Беларускі Хельсінкскі камітэт (БХК), уключаны ў красавіку 2026 г. у пералік экстрэмісцкіх фарміраванняў, і Prismatica, чый Instagram уключаны ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Падпіска на рэсурсы з гэтага спіса пераследуецца паводле артыкула 19.11 КаАП. Медыцынская працэдура гендарнага пераходу захоўваецца, але, паводле даных TG House, на пасяджэнні камісіі 10 чэрвеня 2026 г. адмову атрымалі 19 з 29 заяўнікаў на юрыдычнае прызнанне полу (на двух папярэдніх пасяджэннях доля адмоў складала 80 і 71 %), а публічная інфармацыя пра працэдуру, паводле ацэнкі Хельсінкскага камітэта, можа быць расцэнена як «прапаганда змены полу».
5. **Адначасова змяняюцца ўмовы атрымання абароны за межамі Беларусі.** Паводле даных Eurostat, доля адмоў грамадзянам Беларусі ў першай інстанцыі ў Польшчы выросла з 2,6 % у першым квартале 2026 г. да 24,2 % у другім (n = 310); паводле кумулятыўных справаздач UdSC у чэрвені і ліпені 2026 г. адмовы склалі 67,5 % і 85,4 % рашэнняў па сутнасці, а доля прызнання за 2026 г. знізілася з 95 % на 1 чэрвеня да 79 % на 1 жніўня. У публікацыі са слоў юрыста прыведзена ацэнка зніжэння рэпрэсій з інфармацыі пра краіну, выкарыстанай у адной справе; агульная прычына змянення статыстыкі не ўстаноўлена. Даных па падставах сэксуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці Польшча не публікуе, таму ці ўлічваецца артыкул 19.16 у канкрэтных справах, паводле статыстыкі ўстанавіць нельга.

Тры галоўныя рэкамендацыі. Арганізацыям дапамогі: весці ўзгоднены рэестр выпадкаў прымянення артыкула 19.16 і будаваць кансультаванне як канал, які зніжае рызыку ідэнтыфікацыі карыстальніка. Упраўленню па справах іншаземцаў Польшчы (UdSC): абнавіць краінавую ацэнку з улікам артыкула 19.16, даклада Спецдакладчыка ААН A/HRC/62/52, справаздачы Агентства Еўрапейскага саюза па пытаннях прытулку (EUAA) ад мая 2026 г. і агляду судовай практыкі EUAA ад верасня 2026 г.; публікаваць статыстыку рашэнняў паводле падстаў пераследу ў агрэгаванай форме. Спецыяльным

працэдурам ААН: накіраваць ураду Беларусі камунікацыю аб правапрымяненні прынятай нормы з удзелам Спецдакладчыка па культурных правах.

Асноўным носьбітам абавязацельстваў застаецца Рэспубліка Беларусь: адмена дыскрымінацыйных абмежаванняў, спыненне пераследу за правамернае выказванне і забеспячэнне доступу да інфармацыі і дапамогі патрабуюцца ад яе мандатамі ААН (снежань 2025 г., красавік 2026 г.), беларускімі праваабарончымі арганізацыямі (ліпень 2025 г.) і дзяржавамі ў рамках Універсальнага перыядычнага агляду (лістапад 2025 г.). У дапаўненні ад 8 студзеня 2026 г. Беларусь пазначыла ўсе восем рэкамендацый па сэксуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці як не падтрыманыя, аднёсшы іх да «палітызаваных рэкамендацый, якія змяшчаюць аднабаковыя каштоўнасныя меркаванні».[2] Таму практычныя рэкамендацыі даследавання адрасаваныя найперш інстытуцыям трэціх краін, міжнародным механізмам і арганізацыям.

1. Пытанне, рамка, метад

1.1 Пытанне і межы

Як артыкул 19.16 КаАП змяніў доступ ЛГБТК+ людзей у Беларусі да інфармацыі аб сексуальнай арыентацыі, гендарнай ідэнтычнасці, здароўі і правах і да прававой, псіхалагічнай, медыцынскай дапамогі і дапамогі пры выездзе; якія змены задакументаваныя, якія з'яўляюцца абгрунтаванай рызыкай, якія застаюцца невядомымі; што могуць зрабіць арганізацыі і інстытуцыі. Даследаванне абапіраецца на аналіз праекта нормы ў камунікацыі спецыяльных працэдур ААН OL BLR 13/2025[3] і на судовую практыку па падобных абмежаваннях у іншых краінах (раздзел 2.4), не пераразлічвае BLDPI і не збірае новых інтэрв'ю або апытанняў унутры Беларусі з меркаванняў бяспекі рэспандэнтаў. Ліст OL BLR 13/2025 датычыўся праекта закона; ацэнкі прынятай нормы змяшчаюцца ў заяве экспертаў ААН ад 15 красавіка 2026 г.[4] і ў дакладзе A/HRC/62/52.[5]

1.2 Крыніцы і ацэнка дакладнасці

Даследаванне заснавана на апублікаваных матэрыялах: нарматыўных актах Беларусі і Польшчы; дакументах ААН (чатыры даклады Савету па правах чалавека, даклад Генеральнай Асамблеі, вынікі Універсальнага перыядычнага агляду (далей УПА), заключныя заўвагі трох дагаворных органаў); меркаваннях Камітэта па правах чалавека, рашэннях Еўрапейскага суда па правах чалавека і Суда ЕС; публікацыях беларускіх праваабарончых арганізацый і міжнародных арганізацый; рэцэнзаванай навуковай публікацыі аб эмпірычных наступствах расійскага закона аб «прапагандзе» (раздзел 2.5); афіцыйнай статыстыцы Eurostat і Упраўлення па справах іншаземцаў Польшчы (Urząd do Spraw Cudzoziemców, далей UdSC); публікацыях CMI як носьбітах першасных даных; наборы даных BLDPI. Для дэталізацыі красавіцкага піку дадаткова выкарыстаны даныя BLDPI на ўзроўні паведамленняў і каналаў, якія не ўваходзяць у публічны дэпазіт (раздзел 4.2). Цытаты з англамоўных і польскіх крыніц прыведзены ў перакладзе аўтара. У табліцах пазначаны тыпы выкарыстаных крыніц (табліца 1); яны не з'яўляюцца рэйтынгам надзейнасці. Статус канкрэтнага сцвярджэння вызначаецца яго атрыбуцыяй і даступнымі пацвярджэннямі. Тэкст Закона № 138-З выкарыстаны паводле афіцыйнай публікацыі на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале (18.04.2026, 5-2/3224).

[2] Савет ААН па правах чалавека, Даклад Рабочай групы па ўніверсальным перыядычным аглядзе: Беларусь, A/HRC/61/4, 5 студзеня 2026 г., рэкамендацыі 146.130, 147.7, 147.51, 147.63–147.67, https://docs.un.org/en/A/HRC/61/4; Дадатак: меркаванні адносна высноў і/або рэкамендацый, A/HRC/61/4/Add.1, 8 студзеня 2026 г., https://docs.un.org/en/A/HRC/61/4/Add.1.

[3] Спецыяльныя працэдуры Савета ААН па правах чалавека, камунікацыя OL BLR 13/2025, 3 снежня 2025 г., https://spcommreports.ohchr.org/TMResultsBase/DownLoadPublicCommunicationFile?gId=30573.

[4] УВКПЧ ААН, «Эксперты ААН устрывожаныя законам, скіраваным супраць ЛГБТ, абаронцаў правоў жанчын і незалежных галасоў у Беларусі», прэс-рэліз, 15 красавіка 2026 г., https://www.ohchr.org/en/press-releases/2026/04/un-experts-alarmed-law-targeting-lgbt-womens-rights-advocates-and.

[5] Савет ААН па правах чалавека, Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі: даклад Спецыяльнага дакладчыка Нілса Муйжніекса, A/HRC/62/52, 19 мая 2026 г., пункты 9, 53–55, 60, 129, https://docs.un.org/en/A/HRC/62/52; вусная заява 29 чэрвеня 2026 г.

Табліца 1. Тыпы крыніц, якія выкарыстоўваюцца ў даследаванні

Код	Значэнне	Прыклад
Д1	Першасны дакумент: тэкст нормы, дакумент ААН, афіцыйная статыстыка, судовае рашэнне	Закон № 138-З; A/HRC/62/52; Eurostat
Д2	Выпадак, пра які паведаміла дакументавальная арганізацыя, з захаваннем атрыбуцыі; метад верыфікацыі ўказваецца там, дзе ён раскрыты	выпадкі, задакументаваныя TG House
Д3	Агрэгаваныя даныя арганізацыі або індэкса; метадалогія ўказваецца там, дзе яна апублікаваная	шэраг BLDPI; звесткі TG House пра пасяджэнні камісіі
Д4	Малая выбарка або адзінкавае сведчанне; ілюстрацыя, не статыстыка	апытанні TG House, n = 20–21
Р	Ацэнка рызыкі кампетэнтнай крыніцай пры адсутнасці задакументаванага выпадку	групы прафесійнай рызыкі
Н	Даныя адсутнічаюць або недаступныя	колькасць пратаколаў паводле артыкула 19.16

Крыніца: складзена аўтарам.

Правіла адной крыніцы. Большасць выпадкаў 2025–2026 гг. дакументуе TG House. ILGA-Europe, Prismatica, EUAA, Спецдакладчык ААН (A/HRC/62/52, зноска 61) і CMI перадаюць яе даныя з атрыбуцыяй; у даследаванні гэта лічыцца адной крыніцай. Паходжанне даных правяраецца для кожнага сцвярджэння. Уласныя інтэрв'ю Групы незалежных экспертаў ААН (181 інтэрв'ю за 2025 г. па ўсіх тэмах мандата)[6] служаць асобнай крыніцай звестак там, дзе даклад абапіраецца на іх, а не на пераказ маніторынгаў. Даныя Eurostat па Польшчы заснаваныя на нацыянальнай справаздачнасці і не лічацца незалежным пацвярджэннем статыстыкі UdSC; дакумент ААН або EUAA, які ўзнаўляе маніторынг арганізацыі, не ўтварае новага незалежнага назірання. Паказчыкі розных маніторынгаў не сумуюцца (табліца 6). Сцвярджэнне «фактычныя лічбы вышэйшыя» адносіцца толькі да падлікаў выпадкаў і зваротаў, абмежаваных магчымасцямі дакументавання; да працэнтных доляў і да індэкса яно не ўжываецца.

1.3 Абмежаванні

Дакументаванне ўнутры Беларусі істотна абмежавана рэпрэсіямі, ліквідацыяй арганізацый і рызыкамі для пацярпелых і для тых, хто збірае звесткі; арганізацыі, якія дакументуюць, самі ўказваюць, што значная частка парушэнняў застаецца незафіксаванай.[7] Апытанні TG House выкарыстоўваюцца як ілюстратыўныя звесткі; вядомыя памеры выбарак прыведзены пры апісанні адпаведных вынікаў. Матэрыял па Расіі (раздзел 2.5) апісвае наступствы іншага закона ў іншай краіне. Агульнадаступнай афіцыйнай статыстыкі правапрымянення не знойдзена, таму раздзел 4 абапіраецца на даныя адной арганізацыі з указаннем гэтага абмежавання.

2. Норма, яе месца ў прававой архітэктуры і міжнародныя стандарты

2.1 Тэкст, санкцыі, тэрміны

Артыкул 19.16 «Прапаганда гомасексуальных адносін, змены полу, бяздзетнасці, педафіліі» уведзены пунктам 85 артыкула 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 15 красавіка 2026 г. № 138-З «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай адказнасці».[8] Праект унесены ў Палату прадстаўнікоў Саветам Міністраў 9 ліпеня 2025 г. (увах. № 3323),[9] прыняты ў першым чытанні ў кастрычніку 2025 г. і ў другім 13 сакавіка 2026 г., адобраны Саветам Рэспублікі 2 красавіка, падпісаны 15 красавіка, афіцыйна апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале 18 красавіка 2026 г. (рэг. № 5-2/3224).

[6] Савет ААН па правах чалавека, Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі: даклад Групы незалежных экспертаў, A/HRC/61/57, 6 лютага 2026 г., пункты 13, 30, 44–46, 52, 113, https://docs.un.org/en/A/HRC/61/57.

[7] TG House, Маніторынг рэпрэсій і дыскрымінацыі ў дачыненні да беларускай ЛГБТК+ супольнасці ў 2025 годзе, Варшава, 28 студзеня 2026 г., https://wp.tbelarus.com/wp-content/uploads/2026/01/the-monitoring-of-repression-and-discrimination-against-belarusian-lgbtq-community-in-2025-en.pdf.

[8] Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 красавіка 2026 г. № 138-З «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай адказнасці», артыкул 1 пункт 85, артыкул 4; Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 18 красавіка 2026 г., рэг. № 5-2/3224, https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12600138 (дата звароту: 21.09.2026).

[9] Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Законапраекты, якія паступілі на разгляд у Палату прадстаўнікоў: «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай адказнасці», уваход. № 3323, 09.07.2025, https://house.gov.by/ru/zakony-ru/curr_conv/21/curr_session/98 (дата звароту: 23.09.2026).

Паводле артыкула 4 закона пункт 85 уступіў у сілу праз два месяцы пасля апублікавання, 19 чэрвеня 2026 г.

Частка 1: «Распаўсюджванне ў любой форме інфармацыі ў мэтах фарміравання ў грамадзян уяўленняў аб прывабнасці гомасексуальных адносін, змены полу, бяздзетнасці або аб прызнанні педафіліі дапушчальнай». Частка 2: тое ж дзеянне, «якое пацягнула азнаямленне непаўналетняга з такой інфармацыяй». Базавая велічыня (БВ) з 1 студзеня 2026 г. складае 45 рублёў[10]; пераразлік у еўра выкананы паводле афіцыйнага курса Нацыянальнага банка на 19 верасня 2026 г. (3,4736 рубля за еўра) і акруглены да дзясяткаў.[11]

Табліца 2. Санкцыі па артыкуле 19.16 КаАП

Суб'ект	Частка 1	Частка 2
Фізічная асоба	штраф да 20 БВ: да 900 руб. (каля 260 €)	штраф 20–30 БВ: 900–1 350 руб. (каля 260–390 €), або грамадскія работы, або адміністрацыйны арышт да 15 сутак
Індывідуальны прадпрымальнік	да 100 БВ: да 4 500 руб. (каля 1 300 €)	100–150 БВ: 4 500–6 750 руб. (каля 1 300–1 940 €)
Юрыдычная асоба	100–150 БВ: 4 500–6 750 руб. (каля 1 300–1 940 €)	150–200 БВ: 6 750–9 000 руб. (каля 1 940–2 590 €)

Крыніца: Закон № 138-З; Пастанова Савета Міністраў № 651; НБРБ, курс на 19.09.2026. Разлік аўтара.

Тым жа законам уведзены артыкул 24.62 «Незаконнае прадстаўленне Рэспублікі Беларусь на міжнародных мерапрыемствах» і пашырана адказнасць за атрыманне і нямэтавае выкарыстанне замежнай дапамогі (артыкул 24.53). Lawtrend характарызуе пакет як пашырэнне адміністрацыйнага рэгулявання трох сфер дзейнасці грамадзянскай супольнасці: інфармацыйнай, фінансавай і міжнароднай.[12] Эксперты ААН адзначылі, што артыкул 24.62 можа прымяняцца да тых, хто ўзаемадзейнічае з ААН.[13]

2.2 Месца нормы сярод дзеючых абмежаванняў

На 19 чэрвеня 2026 г. дзейнічалі пяць механізмаў, якія абмяжоўваюць інфармацыю пра ЛГБТК+ людзей; яны адрозніваюцца паводле падставы і віду адказнасці (табліца 3).[14,15] Артыкул 19.16 уводзіць самастойную падставу адміністрацыйнай адказнасці за распаўсюд інфармацыі з указанай у артыкуле мэтай. У адрозненне ад адказнасці за распаўсюд матэрыялаў з Рэспубліканскага спіса экстрэмісцкіх матэрыялаў, яе прымяненне не абумоўлена папярэднім уключэннем канкрэтнага матэрыялу ў такі спіс; у адрозненне ад артыкула 37-1 Закона «Аб правах дзіцяці» яна не абмежавана інфармацыяй, адрасаванай дзецям.

[10] Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 20 лістапада 2025 г. № 651 «Аб устанаўленні памеру базавай велічыні», Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.11.2025, № 6-1/55458 (у сіле з 1 студзеня 2026 г.); гл. таксама https://pravo.by/novosti/novosti-pravo-by/2025/november/91047/.

[11] Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, афіцыйны курс беларускага рубля да еўра на 19 верасня 2026 г. (3,4736), https://www.nbrb.by/statistics/rates/ratesdaily.

[12] Lawtrend, Маніторынг сітуацыі са свабодай асацыяцый і становішчам арганізацый грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь. Красавік 2026, май 2026 г., https://www.lawtrend.org/wp-content/uploads/2026/05/Monitoring-aprel-2026.pdf.

[13] УВКПЧ ААН, прэс-рэліз 15.04.2026.

[14] Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 19 сакавіка 2024 г. № 24 «Аб змяненні пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 8 мая 2007 г. № 18», Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 11.04.2024, № 8/41365 (у сіле з 12 красавіка 2024 г.), https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22441365.

[15] Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2025 г. № 86-З «Аб змяненні законаў па пытаннях забеспячэння правоў дзяцей», Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 16.07.2025, № 5-2/3172; артыкул 1 пункт 21 (частка другая артыкула 37-1 Закона «Аб правах дзіцяці»), артыкул 8 (уступленне ў сілу праз шэсць месяцаў пасля афіцыйнага апублікавання), https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12500086.

Табліца 3. Механізмы абмежавання інфармацыі пра ЛГБТК+ людзей у Беларусі па стане на 19 чэрвеня 2026 г.

Механізм	Дзейнічае з	Што забаронена	Хто адказвае	Адказнасць	Умова прымянення
Пастанова Мінкультуры № 24: дапаўняе Інструкцыю аб эратычнай прадукцыі вызначэннем «нетрадыцыйныя палавыя адносіны і (або) палавыя паводзіны» (у тым ліку «гомасексуалізм, лесбійскае каханне», «транссексуалізм») і адносіць іх да «сексуальных вычварэнняў»	12.04.2024	дэманстрацыя, захоўванне з мэтай распаўсюджвання і распаўсюджванне матэрыялаў, прызнаных парнаграфічнымі	аўтар, распаўсюджвальнік	адміністрацыйная (арт. 19.7 КаАП, 2–30 БВ) або крымінальная (арт. 343 Крымінальнага кодэкса, да 4 гадоў)	кваліфікацыя канкрэтнага матэрыялу як парнаграфіі
Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў	ЛГБТК+ рэсурсы з 28.03.2024	распаўсюджванне матэрыялаў са спіса; на практыцы пераследуюцца падпіска і захоўванне	распаўсюднік, карыстальнік	адміністрацыйная (арт. 19.11 КаАП: штраф, арышт да 15 сутак, канфіскацыя)	рашэнне суда аб уключэнні канкрэтнага рэсурсу
Пералік арганізацый, фарміраванняў і ІП, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці (вядзе МУС паводле пастановы Саўміна № 575)	праваабарончыя і ЛГБТК+-дружалюбныя структуры, 2023–2026 гг.	удзел, садзейнічанне, фінансаванне	удзельнікі, асобы, якія аказваюць садзейнічанне	крымінальная (арт. 361-1, 361-4 Крымінальнага кодэкса)	рашэнне МУС, КДБ або суда аб канкрэтнай структуры
Спіс друкаваных выданняў, «якія наносяць шкоду нацыянальным інтарэсам»	21.11.2024	распаўсюджванне выданняў са спіса	прадавец, выдавец, бібліятэка	адміністрацыйная	рашэнне камісіі па канкрэтным выданні
Закон «Аб правах дзіцяці», артыкул 37-1, частка другая	17.01.2026	інфармацыя, «якая дыскрэдытуе інстытут сям'і і шлюбна-сямейныя адносіны, накіраваная на прапаганду гомасексуальных адносін, змены полу, педафіліі, бяздзетнасці», як шкодная для здароўя і развіцця дзяцей	распаўсюджвальнік інфармацыі для дзяцей	праз сумежныя нормы	адрасат — непаўналетні
Артыкул 19.16 КаАП	19.06.2026	распаўсюджванне інфармацыі, прызнанай накіраванай на фарміраванне «уяўленняў аб прывабнасці»	распаўсюджвальнік, уключаючы прыватных асоб	адміністрацыйная: штраф, работы, арышт; юрыдычныя асобы да 200 БВ	кваліфікацыя мэты распаўсюджвання правапрымяняльнікам; папярэдняга акта аб матэрыяле не патрабуецца

Крыніцы: Пастанова Мінкультуры № 24; афіцыйныя спісы Міністэрства інфармацыі; пералік МУС і пастанова Саўміна № 575; A/HRC/59/59, п. 62–63, 80; Закон № 86-З; Закон № 138-З. Даты пастановы № 24 прыводзяцца паводле акта (прынята 19.03.2024, апублікавана 11.04.2024, у сіле з 12.04.2024); у A/HRC/62/52 (п. 53) змяненне датавана красавіком 2025 г.

2.3 Што норма не вызначае

У заканадаўстве Беларусі няма вызначэнняў «гомасексуальных адносін», «бяздзетнасці» і «прывабнасці»; «змена полу» вызначана толькі як медыцынская працэдура.[16] Тэрмін «педафілія» заканадаўча не вызначаны: крымінальны закон карае канкрэтныя дзеянні сексуальнага характару ў дачыненні да асоб, якія не дасягнулі шаснаццаці гадоў (артыкул 168 Крымінальнага кодэкса і сумежныя саставы), а медыцынская класіфікацыя апісвае расстройства сексуальнай перавагі (F65.4 паводле МКХ-10).[17] «Распаўсюджванне інфармацыі» паводле Закона аб інфармацыі ахоплівае вусную, пісьмовую, аўдыя- і візуальную форму і «азнаямленне нявызначанага кола асоб»; ці распаўсюджваецца гэта на закрытыя групы, норма не ўдакладняе.

Асноўную нявызначанасць стварае формула «у мэтах фарміравання ў грамадзян уяўленняў пра прывабнасць». Беларускі Хельсінкскі камітэт апісвае два сцэнарыі: шырокі, пры якім сама публічная даступнасць інфармацыі пра сексуальную арыентацыю разглядаецца як такая, што ўплывае на «ўяўленні», і вузкі, які патрабуе прамога або ўскоснага закліку ўспрымаць з'яву як норму.[18] Расійскі артыкул 6.21 КаАП РФ, які паслужыў узорам, змяшчае больш разгорнутае вызначэнне; беларуская норма карацейшая. Lawtrend: «нават нейтральнае інфармаванне, даследаванні або адукацыйныя праграмы могуць быць інтэрпрэтаваныя як "фарміраванне станоўчага стаўлення"».[19] Эксперты ААН: фармулёўкі «могуць стварыць умовы для адвольнага прымянення».[20] Медыцынская працэдура гендарнага пераходу застаецца легальнай, але, паводле ацэнкі Хельсінкскага камітэта, «абмеркаванне яе працы, публічны абмен досведам і парадамі, як яе праходзіць, можа быць расцэнена як "прапаганда"». Частка 1 дзейнічае незалежна ад узросту адрасата; частка 2 толькі ўзмацняе санкцыю. У разгледжаных крыніцах апублікаваных рашэнняў за перыяд да 31 жніўня 2026 г. не знойдзена.

2.4 Міжнародныя стандарты

Камітэт ААН па правах чалавека двойчы прызнаваў расійскія рэгіянальныя законы аб «прапагандзе» (Разанскай і Архангельскай абласцей) парушэннем артыкулаў 19 і 26 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП): Фядотава супраць Расійскай Федэрацыі (2012)[21] і Непамняшчы супраць Расійскай Федэрацыі (2018).[22] Прававыя падыходы, выкладзеныя ў гэтых меркаваннях, важныя для ацэнкі беларускай нормы. Пры гэтым магчымасць падачы новых індывідуальных паведамленняў супраць Беларусі ў Камітэт закрыта пасля ўступлення ў сілу дэнансацыі Першага факультатыўнага пратакола да Пакта 8 лютага 2023 г.; адзіным дагаворным органам, кампетэнтным разглядаць індывідуальныя скаргі, застаецца Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын.[23] Абавязацельствы паводле самога Пакта захоўваюцца. У заключных заўвагах 2018 г. Камітэт рэкамендаваў Беларусі ўключыць сексуальную арыентацыю і гендарную ідэнтычнасць у антыдыскрымінацыйнае заканадаўства і адзначыў парушэнні прыватнасці трансгендарных людзей праз лічбу полу ў ідэнтыфікацыйным нумары пашпарта і катэгорыю 19а ў ваенных білетах.[24]

Камітэт па правах дзіцяці ў 2020 г. рэкамендаваў Беларусі антыдыскрымінацыйнае заканадаўства, якое ахоплівае сексуальную арыентацыю і гендарную ідэнтычнасць, абарону ЛГБТК+ дзяцей ад булінгу і сексуальную адукацыю з увагай «да пытанняў сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці»[25]; у Заўвазе агульнага парадку № 20 Камітэт патрабуе адмяніць законы, якія дыскрымінуюць па гэтых

---

[16] Пастанова Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 9 снежня 2010 г. № 163 «Аб змяненні і карэкцыі палавой прыналежнасці», у рэдакцыі пастановы ад 10 верасня 2025 г. № 100 (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал, 17.09.2025, № 11-2/43801; у сіле з 18 верасня 2025 г.), https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=W21023106.

[17] Беларускі Хельсінкскі камітэт і Prismatica, «Папраўкі ў КаАП: што яны значаць для ЛГБТК+ і чайлдфры», 15 красавіка 2026 г., https://belhelcom.org/ru/news/popravki-v-koap-chto-oni-znachat-dlya-lgbtk-i-chayldfri.

[18] БХК і Prismatica, 15.04.2026.

[19] Lawtrend, красавік 2026.

[20] УВКПЧ ААН, прэс-рэліз 15.04.2026.

[21] Камітэт ААН па правах чалавека, Фядотава супраць Расійскай Федэрацыі (Fedotova v. Russian Federation), паведамленне № 1932/2010, меркаванні ад 31 кастрычніка 2012 г., CCPR/C/106/D/1932/2010, https://docs.un.org/en/CCPR/C/106/D/1932/2010.

[22] Камітэт ААН па правах чалавека, Няпомняшчы супраць Расійскай Федэрацыі (Nepomnyashchiy v. Russian Federation), паведамленне № 2318/2013, меркаванні ад 17 ліпеня 2018 г., CCPR/C/123/D/2318/2013, https://juris.ohchr.org/casedetails/2546/en-US.

[23] Генеральная Асамблея ААН, Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі: даклад Спецыяльнага дакладчыка, A/79/201, 19 ліпеня 2024 г., пункты 7, 29–31, https://docs.un.org/en/A/79/201.

[24] Камітэт ААН па правах чалавека, Заключныя заўвагі па пятым перыядычным дакладзе Беларусі, CCPR/C/BLR/CO/5, 22 лістапада 2018 г., пункты 19–20, https://docs.un.org/en/CCPR/C/BLR/CO/5.

[25] Камітэт ААН па правах дзіцяці, Заключныя заўвагі па аб'яднаных пятым і шостым перыядычных дакладах Беларусі, CRC/C/BLR/CO/5-6, 28 лютага 2020 г., пункты 15(a), 20(e), 21(d), 34(b), https://docs.un.org/en/CRC/C/BLR/CO/5-6.

прыкметах, і ліквідаваць бар'еры доступу ЛГБТК+ падлеткаў да інфармацыі і паслуг.[26] Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын у лютым 2025 г. рэкамендаваў Беларусі забяспечыць жанчынам аўтаномію ў вырашэнні пытання, ці мець дзяцей, і ліквідаваць практыкі, якія караюць за рэпрадуктыўны выбар[27]; праз чатырнаццаць месяцаў «прапаганда бяздзетнасці» стала адміністрацыйным правапарушэннем.

Еўрапейскі суд па правах чалавека (далей ЕСПЧ) у справе «Баеў і іншыя супраць Расіі» (Bayev and Others v. Russia, 2017) прызнаў расійскія законы аб «прапагандзе» парушэннем артыкулаў 10 і 14 Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека.[28] Вялікая палата ЕСПЧ у справе «Мацатэ супраць Літвы» (Macatė v. Lithuania, 2023) аднагалосна ўстанавіла, што маркіроўка дзіцячай кнігі з казкамі пра аднаполыя сем'і як шкоднай для дзяцей не пераследуе легітымнай мэты[29]; гэта найбліжэйшы прэцэдэнт да беларускага спіса забароненых выданняў. Беларусь не з'яўляецца ўдзельніцай Канвенцыі; практыка Суда мае для яе параўнальнае значэнне. Суд Еўрапейскага саюза (далей Суд ЕС) 21 красавіка 2026 г. у справе «Камісія супраць Венгрыі» (Commission v Hungary, C-769/22) упершыню ў працэсе супраць дзяржавы-члена канстатаваў самастойнае парушэнне артыкула 2 Дагавора аб ЕС законам, які абмяжоўвае доступ да ЛГБТК+ кантэнту пад прэтэкстам абароны дзяцей.[30] Права ЕС да Беларусі не прымяняецца; значэнне рашэння ў тым, што ў ЕС ёсць пазіцыя найвышэйшай судовай інстанцыі адносна законаў гэтага тыпу, на якую могуць абапірацца яго знешнепалітычныя заявы. Для працэдур міжнароднай абароны Суд ЕС устанавіў, што ад заяўніка нельга патрабаваць хаваць сексуальную арыентацыю (аб'яднаныя справы X, Y і Z супраць міністра па іміграцыі і прытулку Нідэрландаў, заяўнікі абазначаныя літарамі, C-199/12–C-201/12, 2013)[31] і абмежаваў спосабы яе праверкі (справы A, B і C, C-148/13–C-150/13, 2014)[32]; Кіраўнічыя прынцыпы Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ ААН) № 9 задаюць стандарт ацэнкі такіх заяў.[33] EUAA у аглядзе судовай практыкі за 2025–2026 гг. падсумоўвае: крыміналізацыя або прававыя абмежаванні выказвання могуць з'яўляцца пераследам; позняе раскрыццё арыентацыі само па сабе не з'яўляецца дастатковай падставай прызнаць заяву недаставерной; цэнтралізаваных даных ЕС аб заявах па прыкмеце сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці не існуе.[34]

[26] Камітэт ААН па правах дзіцяці, Заўвага агульнага парадку № 20 (2016), CRC/C/GC/20, 6 снежня 2016 г., пункты 33–34, 60, https://docs.un.org/en/CRC/C/GC/20.

[27] Камітэт ААН па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын, Заключныя заўвагі па дзявятым перыядычным дакладзе Беларусі, CEDAW/C/BLR/CO/9, 27 лютага 2025 г., пункт 30, https://docs.un.org/en/CEDAW/C/BLR/CO/9.

[28] Еўрапейскі суд па правах чалавека, Баеў і іншыя супраць Расіі (Bayev and Others v. Russia), заявы № 67667/09, 44092/12 і 56717/12, пастанова ад 20 чэрвеня 2017 г., https://hudoc.echr.coe.int/eng?i=001-174422.

[29] Еўрапейскі суд па правах чалавека (Вялікая палата), Мацатэ супраць Літвы (Macatė v. Lithuania), заява № 61435/19, пастанова ад 23 студзеня 2023 г., https://hudoc.echr.coe.int/eng?i=001-222072.

[30] Суд Еўрапейскага саюза, рашэнне ад 21 красавіка 2026 г., Камісія супраць Венгрыі (Commission v Hungary), C-769/22, ECLI:EU:C:2026:326; прэс-рэліз № 59/26, https://curia.europa.eu/site/upload/docs/application/pdf/2026-04/cp260059en.pdf.

[31] Суд Еўрапейскага саюза, рашэнне ад 7 лістапада 2013 г., X, Y, Z, аб'яднаныя справы C-199/12–C-201/12, ECLI:EU:C:2013:720, https://eur-lex.europa.eu/legal-content/EN/TXT/?uri=CELEX:62012CJ0199.

[32] Суд Еўрапейскага саюза, рашэнне ад 2 снежня 2014 г., A, B, C, аб'яднаныя справы C-148/13–C-150/13, ECLI:EU:C:2014:2406, https://eur-lex.europa.eu/legal-content/EN/ALL/?uri=CELEX%3A62013CJ0148.

[33] УВКБ ААН, Кіраўнічыя прынцыпы па міжнароднай абароне № 9, HCR/GIP/12/09, 23 кастрычніка 2012 г., https://www.refworld.org/policy/legalguidance/unhcr/2012/en/89548.

[34] Агенцтва Еўрапейскага саюза па пытаннях прытулку (EUAA), Судовая практыка, звязаная з ЛГБТІК-заяўнікамі на міжнародную абарону, інфармацыйная даведка EUAA/2026/47, верасень 2026 г., https://caselaw.euaa.europa.eu/Documents/2026_factsheet47_case_law_LGBTIQ_applicants_EN.pdf.

Табліца 4. Элементы артыкула 19.16 і прымяняльныя міжнародныя стандарты

Элемент нормы	Закранутае права	Прымяняльны стандарт	Праблема
«Распаўсюджванне ў любой форме інфармацыі» без вызначэння прадмета («гомасексуальныя адносіны», «бяздзетнасць»)	свабода выказвання; законнасць абмежавання	арт. 19 (3) МПГПП: абмежаванне павінна быць прадугледжана законам, сфармуляваным дастаткова дакладна	няпэўнасць тэрмінаў ускладняе прадбачанне таго, якое паведамленне правапрымяняльнік палічыць парушэннем (патрабаванне пэўнасці: CCPR/C/GC/34, п. 25)
Мэтавая прыкмета «у мэтах фарміравання ўяўленняў пра прывабнасць»	свабода выказвання; забарона дыскрымінацыі	арт. 19, 26 МПГПП; Фядотава і Няпомняшчы супраць РФ: забарона «прапаганды» паводле прыкметы арыентацыі сама з'яўляецца дыскрымінацыяй	няпэўнасць мэтавай прыкметы стварае рызыку таго, што нейтральная або пазітыўная інфармацыя пра ЛГБТК+ людзей будзе кваліфікаваная як адміністрацыйнае правапарушэнне; апублікаванай практыкі, якая дазваляе ўстанавіць межы тлумачэння, не знойдзена
Частка 1: адказнасць незалежна ад узросту адрасата; частка 2: узмоцненая санкцыя пры азнаямленні непаўналетняга	свабода выказвання; права дзяцей на інфармацыю	арт. 13, 17 Канвенцыі аб правах дзіцяці (КПД); CRC/C/GC/20, п. 33–34, 60; «Мацатэ супраць Літвы»	заяўленая мэта абароны дзяцей не тлумачыць частку 1; для дзяцей і падлеткаў стандарты патрабуюць доступу да ўзростава-адэкватнай інфармацыі, а не забароны
Штраф, грамадскія работы, арышт да 15 сутак; юрыдычныя асобы да 200 БВ	суразмернасць абмежавання	арт. 19 (3) МПГПП: неабходнасць і суразмернасць; «Баеў і іншыя супраць Расіі» («Баев и другие против России»)	арышт да 15 сутак за выказванне пра законную з'яву патрабуе праверкі на неабходнасць і суразмернасць (CCPR/C/GC/34, п. 33–35); высокія штрафы для арганізацый ствараюць рызыку адмовы ад правамернай інфармацыйнай і асветніцкай дзейнасці
«Змена полу» як прадмет забароненай інфармацыі	права на здароўе; доступ да медыцынскай інфармацыі	арт. 12 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (МПЭСКП); CCPR/C/BLR/CO/5, п. 19–20; A/HRC/62/52, п. 55	легальная медыцынская працэдура застаецца, але інфармацыя пра яе і абмен досведам трапляюць пад рызыку кваліфікацыі як «прапаганда»
«Бяздзетнасць» як прадмет забароненай інфармацыі	рэпрадуктыўная аўтаномія; роўнасць жанчын	арт. 16 Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын (КЛДЖ); CEDAW/C/BLR/CO/9, п. 30	пасля рэкамендацыі Камітэта ўведзена адказнасць за распаўсюджванне інфармацыі, накіраванай на фарміраванне ўяўленняў пра прывабнасць бяздзетнасці; гэта стварае рызыку абмежавання абмеркавання рэпрадуктыўнага выбару

Крыніца: складзена аўтарам паводле тэксту Закона № 138-З і дакументаў, указаных у слупку «Прымяняльны стандарт»; патрабаванні вызначанасці, неабходнасці і суразмернасці — CCPR/C/GC/34.[35]

Публічнае абгрунтаванне норм аб «прапагандзе» ў Беларусі, як і ў Расіі, апелюе да абароны дзяцей[36]; частка 2 артыкула 19.16 вылучае азнаямленне непаўналетніх. Гэты аргумент не дае адказу на прыведзеныя праблемы па трох прычынах: частка 1 прымяняецца незалежна ад узросту адрасата, таму абарона дзяцей сама па сабе не тлумачыць абмежавання інфармацыі, якая распаўсюджваецца сярод дарослых; для саміх дзяцей міжнародныя стандарты патрабуюць доступу да адпаведнай узросту інфармацыі пра сексуальную арыентацыю і гендарную ідэнтычнасць, а не яе забароны[37]; і ў справах Баеў (Bayev), Мацатэ (Macatė) і С-769/22 суды, якія разглядалі той самы аргумент у дачыненні да расійскага, літоўскага і венгерскага законаў, прызналі, што абмежаванне інфармацыі пра ЛГБТК+ людзей не служыць абароне дзяцей і замацоўвае прадузятасць;[38,39,40] для ацэнкі беларускай нормы іх высновы маюць параўнальнае значэнне.

[35] Камітэт ААН па правах чалавека, Заўвага агульнага парадку № 34 (2011) аб свабодзе меркаванняў і іх выказвання, CCPR/C/GC/34, 12 верасня 2011 г., пункты 25, 33–35, https://docs.un.org/en/CCPR/C/GC/34.

[36] Human Rights Watch, Без падтрымкі: расійскі закон аб «гей-прапагандзе» ставіць пад пагрозу ЛГБТ-моладзь, 11 снежня 2018 г., https://www.hrw.org/report/2018/12/11/no-support/russias-gay-propaganda-law-imperils-lgbt-youth; Human Rights Watch, «Беларусь імпартуе расійскі сцэнар "прапаганды"», 10 красавіка 2026 г., https://www.hrw.org/news/2026/04/10/belarus-imports-russias-propaganda-playbook; Human Rights Watch, Сусветная справаздача 2026: Беларусь, https://www.hrw.org/world-report/2026/country-chapters/belarus.

[37] CRC/C/GC/20.

[38] Bayev and Others v. Russia.

[39] Macatė v. Lithuania.

[40] C-769/22.

У межах Універсальнага перыядычнага агляду ў лістападзе 2025 г. Беларусь атрымала восем рэкамендацый па сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці (146.130, 147.7, 147.51, 147.63–147.67), уключаючы рэкамендацыі Партугаліі (147.63) і Даніі (147.67) адмовіцца ад праекта артыкула 19.16. У студзені 2026 г. Беларусь адхіліла ўсе восем.[41]

2.5 Рэгіянальны кантэкст

Формула артыкула 19.16 запазычвае мадэль расійскага артыкула 6.21 КаАП РФ (2013 г., з 2022 г. без узроставага парога, са снежня 2024 г. таксама «адмова ад дзетанараджэння»[42]); Human Rights Watch характарызуе беларускі закон як запазычанне расійскай мадэлі.[43] Нормы аб «прапагандзе» дзейнічаюць таксама ў Венгрыі (2021), Кыргызстане (2023), Балгарыі (2024, у адукацыі), Грузіі (2024) і Казахстане (снежань 2025); для інстытуцый ЕС гэта азначае, што беларускі закон належыць да тыпу, па якім у ЕС з красавіка 2026 г. ёсць судовая пазіцыя.[44] Эмпірычныя даныя пра шкоду такіх норм атрыманы ў Маскве: у папярочным даследаванні мужчын, якія практыкуюць секс з мужчынамі (MCM; збор даных кастрычнік 2010 г. – красавік 2013 г.), сярод тых, хто паведамляў пра перажытую стыгму, апытанне пасля прыняцця закона Санкт-Пецярбурга ад 7 сакавіка 2012 г. аб забароне «прапаганды гомасексуалізму» сярод непаўналетніх, які папярэднічаў федэральнаму закону 2013 г., было звязана з павышанымі шанцамі на выразныя дэпрэсіўныя сімптомы паводле шкалы CES-D (скарэктаваныя адносіны шанцаў 2,24; 95 % ДІ 1,49–3,39); дызайн не дазваляе ўстанавіць прычынны эфект закона, і гэтыя даныя не вымяраюць наступстваў беларускай нормы.[45]

3. Зыходны стан на 19 чэрвеня 2026 г.

Раздзел апісвае абмежаванні, якія склаліся да 19 чэрвеня 2026 г.; пазнейшыя абнаўленні афіцыйных пералікаў указаныя асобна.

3.1 Арганізацыі

Паводле маніторынгу Lawtrend, з 2021 г. да канца красавіка 2026 г. прымусова ліквідавана не менш за 1 240 некамерцыйных арганізацый і не менш за 782 арганізацыі самаліквідаваліся; сукупныя страты сектара з 2020 г. — не менш за 2 022 арганізацыі.[46] Паводле ацэнкі TG House у дакладзе да УПА 2025 г., ЛГБТК+ арганізацыі, што дзейнічалі раней, ліквідаваны: «Усе арганізацыі, што існавалі раней, ліквідаваны. У выніку ЛГБТК+ людзі пазбаўлены доступу да прававой, сацыяльнай і псіхалагічнай падтрымкі ў межах закона».[47] Пералік арганізацый, фарміраванняў і індывідуальных прадпрымальнікаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці, які МУС вядзе паводле рашэнняў МУС, КДБ і судоў[48], станам на 20 жніўня 2026 г. змяшчаў 377 пазіцый скразной нумарацыі, з іх дзве (№ 373 і 375) — рашэнні аб унясенні змяненняў у раней уключаныя запісы, гэта значыць 375 самастойных суб'ектаў. Падлікі арганізацый адрозніваюцца спосабам адсячэння: Lawtrend называе 365 суб'ектаў на канец красавіка 2026 г. — па столькіх пазіцыях рашэнні ўступілі ў сілу да 30 красавіка (пазіцыя № 365 унесена ў пералік 4 мая);

---

[41] A/HRC/61/4; A/HRC/61/4/Add.1.

[42] Федэральны закон Расійскай Федэрацыі ад 23 лістапада 2024 г. № 401-ФЗ «Аб унясенні змяненняў у артыкул 6.21 Кодэкса Расійскай Федэрацыі аб адміністрацыйных правапарушэннях» (у сіле з 4 снежня 2024 г.), https://www.consultant.ru/document/cons_doc_LAW_491336/.

[43] Human Rights Watch.

[44] Расійская Федэрацыя: Федэральны закон ад 29 чэрвеня 2013 г. № 135-ФЗ; Федэральны закон ад 5 снежня 2022 г. № 478-ФЗ; рашэнне Вярхоўнага Суда ад 30 лістапада 2023 г. Венгрыя: Закон LXXIX 2021 г. Кыргызстан: закон падпісаны 14 жніўня 2023 г. (TGEU, https://tgeu.org/kyrgyzstan-passes-anti-lgbti-propaganda-law/). Балгарыя: папраўкі да Закона аб дашкольнай і школьнай адукацыі ад 7 жніўня 2024 г. (ILGA-Europe). Грузія: закон прыняты 17 верасня 2024 г., падпісаны 3 кастрычніка 2024 г. (УВКПЧ ААН, прэс-рэліз 25 верасня 2024 г.). Казахстан: закон падпісаны 30 снежня 2025 г. (Tengrinews, 30 снежня 2025 г.).

[45] Hylton, E., Wirtz, A. L., Zelaya, C. E. і інш., «Сексуальная ідэнтычнасць, стыгма і дэпрэсія: роля “антыгейскага закона аб прапагандзе” ў стане псіхічнага здароўя мужчын, якія маюць секс з мужчынамі, у Маскве, Расія», Journal of Urban Health, т. 94, № 3, 2017, с. 319–329, https://doi.org/10.1007/s11524-017-0133-6; поўны тэкст: https://pmc.ncbi.nlm.nih.gov/articles/PMC5481210/ (табліца 2 і вынікі).

[46] Lawtrend, красавік 2026.

[47] TG House, Альтэрнатыўны даклад арганізацыі грамадзянскай супольнасці TG House: Універсальны перыядычны агляд, чацвёрты цыкл, Беларусь, Варшава, 7 красавіка 2025 г., пункты 3, 9–15, 19, 21, 25–26, https://uprdoc.ohchr.org/uprweb/downloadfile.aspx?filename=14773&file=EnglishTranslation.

[48] Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 кастрычніка 2021 г. № 575 «Аб мерах супрацьдзеяння экстрэмізму і рэабілітацыі нацызму», Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 14.10.2021, № 5/49521, пункт 1.2, https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22100575.

«Вясна» называе 373 у чэрвені — столькі пазіцый уключана ў пералік да 30 чэрвеня.[49,50,51] Для доступу ЛГБТК+ людзей да інфармацыі і дапамогі значнымі з'яўляюцца ўключаныя ў пералік структуры трох тыпаў: праваабарончыя арганізацыі, якія давалі прававыя тлумачэнні і ажыццяўлялі маніторынг абмежаванняў, — праваабарончы цэнтр «Вясна» (рашэнне МУС ад 24.08.2023), Human Constanta (рашэнне КДБ ад 11.03.2026, уключана 18.03.2026) і Беларускі Хельсінкскі камітэт (рашэнне КДБ ад 31.03.2026, уключаны 06.04.2026); ЛГБТК+-дружалюбныя ініцыятывы, названыя так у аглядзе TG House, — «Spadcyna Belarusi» (рашэнне КДБ ад 11.03.2026, уключана 18.03.2026) і «ІншыЯ» / «The Others» (рашэнне КДБ ад 09.04.2026, уключана 24.04.2026); аб'яднанне адвакатаў — ініцыятыва «Беларуская асацыяцыя адвакатаў па правах чалавека» (уключана 22.08.2025).[52,53] Удзел у фарміраванні караецца паводле артыкула 361-1 Крымінальнага кодэкса, садзейнічанне — паводле артыкула 361-4.

3.2 Анлайн-рэсурсы

Табліца 5. Рэсурсы ЛГБТК+ ініцыятыў і арганізацый, якія асвятляюць правы ЛГБТК+ людзей, уключаныя ў Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, сакавік 2024 г. – красавік 2026 г. (даты ўступлення ў сілу рашэнняў судоў па спісе)

Дата	Рэсурс	Крыніца
28.03.2024	TG House: сайт tghouse.org, Facebook, Instagram, Telegram-канал і чат (суд Цэнтральнага раёна г. Мінска)	спіс Мінінфарма; TG House, даклад да УПА, п. 25; A/HRC/59/59, п. 62
07.06.2024	Сайт belhelcom.org і старонка ў Facebook Беларускага Хельсінкскага камітэта (суд Чыгуначнага раёна г. Гомеля; агульнае рашэнне з рэсурсамі іншых арганізацый)	спіс Мінінфарма
11.09.2025	Медыя DazHip: Instagram das.hip.media (суд Пухавіцкага раёна); Telegram-канал і старонка ў Facebook, названыя ў маніторынгу TG House, у спісе пад гэтай назвай не ідэнтыфікаваныя	спіс Мінінфарма; TG House, маніторынг 2025
25.12.2025	Telegram-чат «Знакомства • ЛГБТ | ЧАТ» (суд Ленінскага раёна г. Магілёва)	спіс Мінінфарма; TG House, маніторынг 2025
24.02.2026	Сайт і сацыяльныя сеткі Human Constanta (суд Чашніцкага раёна)	спіс Мінінфарма; Lawtrend, красавік 2026
05.03.2026	Instagram takija.samyja (суд Савецкага раёна г. Мінска)	спіс Мінінфарма; Prismatica
12.03.2026	Instagram prismatica.belarus (суд Савецкага раёна г. Мінска)	спіс Мінінфарма; TG House, агляд першага паўгоддзя 2026; Prismatica
23.03.2026	Instagram nasta.bazar актывісткі Насты Базар (суд Баранавіцкага раёна і г. Баранавічы)	спіс Мінінфарма; Prismatica
13.04.2026	Instagram jane.horney актывісткі Jane (суд Добрушскага раёна)	спіс Мінінфарма; TG House, агляд першага паўгоддзя 2026

Крыніца: Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў Міністэрства інфармацыі (рэдакцыя з рашэннямі па 18.09.2026): найменне суда і дата ўступлення рашэння ў сілу; ідэнтыфікацыя рэсурсаў — паводле публікацый TG House і Prismatica. Беларускі Хельсінкскі камітэт і Human Constanta — агульнаправаабарончыя арганізацыі, якія асвятляюць у тым ліку правы ЛГБТК+ людзей.[54]

[49] Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Пералік арганізацый, фарміраванняў, індывідуальных прадпрымальнікаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці (рэдакцыя на 20 жніўня 2026 г., 377 пазіцый; вядзецца на падставе пастановы Савета Міністраў ад 12 кастрычніка 2021 г. № 575), https://mvd.gov.by/ru/news/8642 (файл пераліку: https://mvd.gov.by/uploads/news/8642/72b0a138a6d1df7214169df39179eacf9c9b371a.xlsx).

[50] Lawtrend, красавік 2026.

[51] Праваабарончы цэнтр «Вясна», «Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Чэрвень 2026», 6 ліпеня 2026 г., https://spring96.org/en/news/120651.

[52] МУС, пералік арганізацый і фарміраванняў.

[53] TG House, Агляд становішча ЛГБТК+ супольнасці ў Беларусі ў першай палове 2026 года, 29 чэрвеня 2026 г., https://tbelarus.com/post/lgbtq-belarus-overview-first-half-2026.

[54] Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў (рэдакцыя з рашэннямі судоў па 18 верасня 2026 г.), https://mininform.gov.by/ru/respublikanskiy-spisok-ekstremistskikh-materialov-ru/ (файл спісу: https://mininform.gov.by/uploads/spisok-ekstremistskix-materialov%2026219.doc); Спіс друкаваных выданняў, якія змяшчаюць інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы, распаўсюджванне якіх здольнае нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь (дзейная рэдакцыя, 258 найменняў), https://www.mininform.gov.by/ru/spisok-pechatnykh-izdaniy-soderzhashchikh-informatsionnye-soobshcheniya-i-ili-ru/ (файл спісу: https://www.mininform.gov.by/uploads/Список_вредоносных_печатых_изданий.pdf).

Спіс вырас з 6 982 запісаў у сакавіку 2025 г.[55] да 8 172 у снежні 2025 г.; чвэрць запісаў дададзена за 2025 г.[56] Адказнасць за распаўсюджванне матэрыялаў са спіса прадугледжана артыкулам 19.11 КаАП; на практыцы пераследуюцца падпіска і захоўванне: TG House дакументуе тры выпадкі адміністрацыйнага пераследу за падпіскі ў першым паўгоддзі 2026 г.[57] Уключэнне ў спіс чата для знаёмстваў паказвае, што абмежаванні закранаюць таксама паўсядзённыя зносіны ўнутры супольнасці.

3.3 Друкаваныя выданні

Спіс друкаваных выданняў, «распаўсюджванне якіх здольнае нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам», вядзецца Міністэрствам інфармацыі з 21 лістапада 2024 г.; першы выпуск з 35 выданняў уключаў «мангу, ЛГБТК+ літаратуру, эратычную прозу».[58] Па стане на 15 кастрычніка 2025 г. у спісе было 173 выданні[59], пасля дапаўнення 26 мая 2026 г. — 258.[60,61] Гэта агульная колькасць выданняў у спісе, а не колькасць ЛГБТК+ кніг: крытэрыі ўключэння шырэйшыя. Спецдакладчык ААН па стане на 15 сакавіка 2026 г. называе 330 забароненых кніг[62]; ахоп гэтага падліку ў дакладзе не раскрыты, разыходжанне застаецца нявырашаным; далей выкарыстоўваецца лічба 258 паводле дзейнай рэдакцыі афіцыйнага спіса Міністэрства інфармацыі. Крытэрыі Міністэрства: выданні, «якія прапагандуюць нетрадыцыйныя сексуальныя адносіны … папулярызуюць нетрадыцыйныя для беларускага грамадства субкультуры, а таксама выданні па палавым выхаванні дзяцей». Рашэнні прымае Рэспубліканская камісія па ацэнцы сімволікі, атрыбутыкі і інфармацыйнай прадукцыі; 11 з 22 яе членаў прадстаўляюць сілавыя ведамствы.[63] Human Constanta, аналізуючы афіцыйны спіс, па выніках другога квартала 2026 г. адзначае: «сама прысутнасць ЛГБТК+ персанажаў у тэксце, незалежна ад жанру і мастацкага кантэксту, відаць, застаецца дастатковай падставай для ўключэння кнігі ў спіс».[64] Міністр інфармацыі назваў спіс «не цэнзурай у класічным сэнсе, а аналагам санітарнага кантролю і вакцынацыі адначасова».[65]

3.4 Дыскурс

BLDPI ахоплівае 520 публічных Telegram-каналаў з рэдакцыяй у Беларусі, размеркаваных па дзевяці фіксаваных катэгорыях крыніц; гэта рамка назірання, а не рэпрэзентатыўная выбарка насельніцтва або медыя. Адзінка назірання — публічнае паведамленне канала, уключаючы перасылкі: індэкс вымярае факт распаўсюджвання сігналу гэтай крыніцай, а не аўтарства. Рэлевантныя паведамленні адбіраюцца аўтаматычна, пасля чаго кожнае з іх правяраецца ўручную; кожнаму прысвойваецца код інтэнсіўнасці ціску D (0 — нерэлевантна; 1 — інструменталізацыя, стыгма; 2 — мова варожасці, дэгуманізацыя, пагрозы; 2,5 — інстытуцыйны ціск уладаў). Унёсак паведамлення PI = D · W · L, дзе W — інстытуцыйная вага катэгорыі крыніцы ад 1,0 («жоўтыя» паблікі) да 3,0 (судова-прававая сфера), L = log10(1 + колькасць падпісчыкаў на момант сканавання); месячны PI — сума па паведамленнях, акругленая па катэгорыях. Індэкс пазітыўных сігналаў PDI разлічваецца гэтак жа па паведамленнях, якія абараняюць правы; такія паведамленні ў PI не ўваходзяць. Доля катэгорыі ў PI — доля ўзважанага паказчыка, а не доля публікацый, аўдыторыі або грамадскай думкі; вагі і лагарыфмічнае нармаванне робяць шкалу адчувальнай да буйных каналаў; нулявы PDI азначае адсутнасць сігналаў, выяўленых метадам. Змены складу рамкі фіксуюцца і адзначаюцца ў месячных зводках. **Як чытаць індэкс.** Пункт PI — умоўная адзінка: паведамленне з кодам інтэнсіўнасці 2 з рэспубліканскага медыя (вага 2,2) са 100 000 падпісчыкаў дае 2 · 2,2 · 5,0 = 22 пункты, а такое ж паведамленне з «жоўтага» пабліка (вага 1,0) з 10 000 падпісчыкаў — 8 пунктаў; месячны PI — сума ўнёскаў усіх уключаных паведамленняў (у красавіку 2026 г. 5 020 пунктаў па 426 паведамленнях). PDI разлічваецца гэтак жа па паведамленнях, якія

[55] Савет ААН па правах чалавека, Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі: даклад Спецыяльнага дакладчыка, A/HRC/59/59, 2025 г., пункты 3, 62, 63, 79–81, https://docs.un.org/en/A/HRC/59/59.

[56] A/HRC/61/57.

[57] TG House, агляд першага паўгоддзя 2026.

[58] A/HRC/59/59.

[59] TG House, маніторынг 2025.

[60] БелТА, «Спіс забароненых да распаўсюджвання ў Беларусі друкаваных выданняў папоўніўся 17 найменнямі», 26 мая 2026 г., https://belta.by/society/view/spisok-zapreschennyh-k-rasprostraneniju-v-belarusi-pechatnyh-izdanij-popolnilsja-17-naimenovanijami-782767-2026/.

[61] Міністэрства інфармацыі, афіцыйныя спісы.

[62] A/HRC/62/52.

[63] Наша Ніва, «Хто забараняе ў Беларусі кнігі — вось гэтыя 22 чалавекі», 10 чэрвеня 2026 г., https://nashaniva.com/ru/396663.

[64] Human Constanta, «Экстрэмісцкі» ўніверсітэт і дзесяць тысяч «экстрэмісцкіх матэрыялаў»: агляд барацьбы з «экстрэмізмам» у Беларусі за красавік–чэрвень 2026, 10 верасня 2026 г., https://humanconstanta.org/en/extremist-university-and-ten-thousand-extremist-materials/ (PDF: https://humanconstanta.org/wp-content/uploads/2026/09/eng_extr_q126.docx.pdf); агляд за студзень–сакавік 2026 г., https://humanconstanta.org/obzor-borby-s-ekstremizmom-v-belarusi-za-yanvarmart-2026/.

[65] TG House, маніторынг 2025.

абараняюць правы ЛГБТК+ людзей; нуль у шэрагу месяцаў азначае, што метад не выявіў у 520 каналах ніводнага такога паведамлення. З верасня 2025 г. па сакавік 2026 г. PI трымаўся ў інтэрвале 1 135–1 902 пунктаў у месяц; у большасці месяцаў найбольшая доля PI прыпадала на прапагандысцкія каналы (ад 49 да 74 %), унёсак катэгорыі СМІ заўважна мяняўся (ад 17 да 45 %).[66] Паказчык выкарыстоўвае заданыя аўтарам індэкса вагі і шкалу кадавання; яго пункты не з'яўляюцца колькасцю пацярпелых або ўнікальных чытачоў. Ручная праверка ахоплівае паведамленні, уключаныя ў разлік, і не ацэньвае паўнату аўтаматычнага выяўлення рэлевантных паведамленняў; катэгорыя «СМІ» аб'ядноўвае рэспубліканскія і рэгіянальныя медыя без падзелу паводле формы ўласнасці. Prismatica апісвае асноўныя тэмы гэтага дыскурсу: ЛГБТК+ павестка як заходняя пагроза, сувязь з замежным фінансаваннем, зрошчванне палітычнай і ЛГБТК+ стыгмы.[67]

3.5 Практыка пераследу да прыняцця закона

Спецдакладчык ААН: са жніўня па кастрычнік 2024 г. затрыманыя 32 чалавекі, якія ідэнтыфікуюць сябе як ЛГБТК+, «падчас таго, што выглядала як беспрэцэдэнтны акт рэпрэсій супраць гэтай супольнасці»; крымінальныя справы паводле артыкула 343 Крымінальнага кодэкса ўзбуджаюцца «толькі за размяшчэнне ў сетцы сваіх фотаздымкаў, цалкам апранутымі і без сексуальных дзеянняў».[68] TG House за 2020 – пачатак 2025 г. дакументуе 46 затрыманняў, 40 выпадкаў вымушанай эміграцыі і тры крымінальныя справы паводле артыкула 343 за фотаздымкі[69]; за 2025 г. — рэйд атрада міліцыі асаблівага прызначэння (АМАП) на квір-вечарыну ў мінскім клубе «Рэактар» 19 верасня (10–15 затрыманых, пратаколы аб «дробным хуліганстве»), затрыманне псіхолага Марыны А. супрацоўнікамі КДБ 29 красавіка з пагрозай крымінальнай справы, падстаўныя спатканні праз дадатак для знаёмстваў, ціск на бацькоў тых, хто з'ехаў.[70] Група незалежных экспертаў ААН на падставе ўласных інтэрв'ю пацвярджае, што ЛГБТК+ зняволеныя змяшчаюцца ў катэгорыю «нізкага сацыяльнага статусу» з больш цяжкімі ўмовамі ўтрымання.[71]

4. Першыя месяцы дзеяння нормы: 19 чэрвеня – 31 жніўня 2026 г.

4.1 Правапрымяненне

Першае публічнае паведамленне аб прымяненні нормы датавана 15 жніўня 2026 г.: дырэктар TG House Аліса Сармант паведаміла Еўрарадыё, што арганізацыя «ўжо задакументавала пераслед паводле новага артыкула 19.16 КаАП», без колькасці выпадкаў і дэталяў.[72] 8 верасня Еўрарадыё паводле даных TG House паведаміла пра тры пацверджаныя арганізацыяй выпадкі пераследу паводле артыкула 19.16; даты выпадкаў і іх працэсуальны вынік (выклік, пратакол, штраф, арышт) не раскрытыя; TG House «вядома і пра іншыя выпадкі пераследу за так званую "ЛГБТ-прапаганду", аднак не ўсе з іх удаецца праверыць або пацвердзіць дакументальна».[73] З 1 мая па 31 жніўня арганізацыя атрымала 24 звароты ад ЛГБТК+ людзей, якія сутыкнуліся з перасследам, пагрозамі або рызыкай рэпрэсій; да 8 верасня дзесяць з тых, хто звярнуўся, выехалі з яе дапамогай, сярод іх пяць трансгендарных людзей; афіцыйныя дакументы аб рэпрэсіях мелі шэсць з 24. Сармант: «Заяўкі на эвакуацыю цяпер паступаюць кожны тыдзень, і ў большасці выпадкаў гаворка ідзе не пра абстрактны страх, а пра цалкам аргументаваныя кейсы і рэальны пераслед».[74]

---

[66] BLDPI, версія 2026.08.

[67] Prismatica, заявы аб правах LGBTQI+ у Беларусі, выпускі за студзень – жнівень 2026 г., https://prismatica.community/en-us/statements.

[68] A/HRC/59/59.

[69] TG House, даклад да УПА.

[70] TG House, маніторынг 2025.

[71] A/HRC/61/57.

[72] Еўрарадыё, «Праваабаронцы зафіксавалі першыя пераследы паводле артыкула "прапаганда ЛГБТ" у Беларусі», 15 жніўня 2026 г., паводле звестак TG House, https://euroradio.fm/ru/pravozaschitniki-zafiksirovali-pervye-presledovaniya-po-state-propaganda-lgbt-v-belarusi (англ. версія: https://euroradio.fm/en/human-rights-defenders-document-first-prosecutions-under-belaruss-lgbt-propaganda-law).

[73] Еўрарадыё, «Закон аб "ЛГБТ-прапагандзе": беларускія сілавікі мэтанакіравана пераследуюць квір-людзей», 8 верасня 2026 г., паводле даных TG House, https://euroradio.fm/ru/zakon-o-lgbt-propagande-belorusskie-siloviki-celenapravlenno-presleduyut-kvir-lyudey.

[74] Еўрарадыё, 15.08.2026.

Асобна апублікавана сведчанне Геры, 23 гадоў, пра пераслед пасля ўступлення нормы ў сілу; артыкул, паводле якога вялася вытворчасць, у публікацыі не пазначаны.[75] Першы допыт на пачатку 2024 г. пад падставай справы аб крадзяжы з патрабаваннем выдаліць ЛГБТК+ кантэнт; 25 чэрвеня 2026 г., праз шэсць дзён пасля ўступлення нормы ў сілу, званок участковага з выклікам на допыт за «прапаганду нетрадыцыйных каштоўнасцяў»; выманне тэлефона без працэсуальных дакументаў са спасылкай на актыўнасць у TikTok; выезд у Іспанію ў ліпені. Спосаб ідэнтыфікацыі, паводле даных TG House, — «мэтанакіраваны маніторынг сацыяльных сетак, перадусім Instagram, TikTok і YouTube»[76], праверка тэлефона пры затрыманні з любой нагоды з наступнымі выклікамі людзей з кантактаў.[77] Артыкул 343 Крымінальнага кодэкса выкарыстоўваецца як інструмент запалохвання і прымусу да супрацоўніцтва.[78]

Табліца 6. Серыі даных пра пераслед ЛГБТК+ людзей у Беларусі, якія не варта сумаваць

Серыя	Перыяд	Адзінка	Крыніца	Перасячэнні
46 затрыманняў, у т. л. 16 трансгендарных	2020 – пачатак 2025	падзеі затрымання	Д2 · TG House, даклад да УПА	магчыма перасячэнне з маніторынгам 2025; ступень не ўстаноўлена
20 выпадкаў ціску	студзень–чэрвень 2026	задакументаваныя выпадкі	Д2 · TG House, агляд першага паўгоддзя	магчымае перасячэнне са зваротамі мая–жніўня; ступень не ўстаноўлена
24 звароты, 10 выездаў да 08.09	1 мая – 31 жніўня 2026	звароты і асобы	Д3 · TG House праз Еўрарадыё	звароты не роўныя выпадкам; магчымае перасячэнне з папярэдняй серыяй
3 выпадкі па артыкуле 19.16	паведамлена 08.09.2026; даты не раскрытыя	выпадкі, характар не раскрыты	Д2 · TG House праз Еўрарадыё	магчымае перасячэнне з 24 зваротамі; не ўстаноўлена
«не менш за 12 задакументаваных выпадкаў гендарнага пераследу»	пачатак 2026	выпадкі; крыніца даных не названая	Д1 · эксперты ААН, 15.04.2026	магчымае перасячэнне з 20 выпадкамі; не ўстаноўлена
32 затрыманыя	жнівень–кастрычнік 2024	асобы	Д1 · A/HRC/59/59, п. 79	магчымае перасячэнне з 46 затрыманнямі; не ўстаноўлена

Крыніца: складзена аўтарам. Геаграфія ўсіх серый — Беларусь. Перасячэнні пазначаны як магчымыя там, дзе крыніцы не пацвярджаюць уключэнне канкрэтных выпадкаў; паказчыкі не сумуюцца.

Чаго не знойдзена. Агульнадаступнай афіцыйнай статыстыкі па артыкуле 19.16 не знойдзена; у разгледжаных крыніцах не выяўлена апублікаваных судовых рашэнняў, блакіровак або выдаленняў кантэнту са спасылкай на артыкул, выпадкаў прыцягнення юрыдычных асоб, урача, псіхолага або педагога.

4.2 Інфармацыйнае суправаджэнне

Табліца 7. BLDPI па месяцах, сакавік – жнівень 2026 г.: негатыўныя паведамленні, узважаны індэкс PI і ўклад метакатэгорый каналаў

Месяц	Негатыўныя паведамленні	PI, усяго	Дзяржорганы	СМІ	Адм. рэсурс	Прапагандысцкія каналы (доля PI)
сакавік	212	1 308	73	374	55	806 (62 %)
красавік	426	5 020	1 308	2 237	403	1 072 (21 %)
май	146	822	44	151	64	563 (68 %)
чэрвень	233	1 659	40	742	32	845 (51 %)
ліпень	187	1 177	37	392	21	727 (62 %)
жнівень	111	624	19	108	6	491 (79 %)

Крыніца: BLDPI, версія 2026.08 (файлы bldpi_monthly.csv, bldpi_monthly_by_meta_category.csv). Значэнні PI акруглены да цэлых.

[75] Еўрарадыё, «Квір-беларуска распавяла пра пагрозы сілавікоў і вымушаны ад'езд з краіны», 29 жніўня 2026 г., https://euroradio.fm/ru/kvir-belaruska-rasskazala-ob-ugrozakh-silovikov-i-vynuzhdennom-otezde-iz-strany.

[76] Еўрарадыё, 15.08.2026.

[77] TG House, маніторынг 2025.

[78] TG House, маніторынг 2025.

Малюнак 1. BLDPI, верасень 2025 г. – жнівень 2026 г.: узважаны індэкс ціску PI па ўзбуйненых катэгорыях крыніц і індэкс пазітыўных сігналаў PDI



Крыніца: BLDPI, версія 2026.08 (BLDPI_chart_monthly_PI_PDI.png). Колькасць негатыўных паведамленняў па месяцах — табліца 7.

У красавіку, месяцы прыняцця закона, PI вырас на 283,8 % у параўнанні з сакавіком; уклад дзяржаўных органаў склаў 1 308 пунктаў супраць 73, СМІ — 2 237 супраць 374, адміністрацыйнага рэсурсу (прававладныя грамадскія арганізацыі і дзяржаўныя прадпрыемствы) — 403 супраць 55, прапагандысцкіх каналаў — 1 072 супраць 806. Доля прапагандысцкіх каналаў упала з 62 да 21 %: асноўны ўклад у дыскурсіўны ціск унеслі каналы дзяржаўных органаў і катэгорыя СМІ. У маі, праз месяц пасля прыняцця, PI знізіўся да 822 пунктаў — мінімуму з пачатку назіранняў на той момант (папярэдні мінімум 1 135 у лістападзе 2025 г.), колькасць негатыўных паведамленняў таксама стала мінімальнай (146). У чэрвені, месяцы ўступлення нормы ў сілу, адбыўся другі ўсплёск, утрая меншы за красавіцкі (1 659), пераважна за кошт СМІ (742 супраць 151 у маі, каля 71 % прыросту); уклад дзяржаўных органаў заставаўся невялікім (40 пунктаў). У ліпені і жніўні PI зніжаўся, і ў жніўні зафіксаваны новы мінімум шэрагу: 624 пункты і 111 негатыўных паведамленняў, уклад СМІ 108 супраць 2 237 у красавіку; найбольшую долю індэкса зноў складалі прапагандысцкія каналы (62–79 %). У красавіку вырасла і няўзважаная колькасць негатыўных паведамленняў: з 212 да 426 (табліца 7). Рост PI таму не тлумачыцца толькі вагамі; яго велічыня залежыць таксама ад інтэнсіўнасці кадавання, складу крыніц і ахопнага множніка. Без катэгорыі судоў, якая мае найбольшую вагу, красавіцкі PI склаў бы 4 438 пунктаў, рост у параўнанні з сакавіком — 239 %.

Разбіўка па дзевяці катэгорыях паказвае, якія крыніцы забяспечылі красавіцкі рост. Рэгіянальныя медыя далі 1 564 пункты супраць 208 у сакавіку (76 каналаў з рэлевантнымі паведамленнямі), рэспубліканскія медыя — 673 супраць 166, суды — 582 супраць 0 (паведамленні пра новы закон апублікавалі 42 каналы судоў розных узроўняў), органы выканаўчай улады — 448 супраць 73, сілавыя структуры — 278 супраць 0, дзяржаўныя прадпрыемствы — 301 супраць 22, праўладныя грамадскія арганізацыі — 102 супраць 33; «жоўтыя» паблікі і персанальныя прапагандысцкія каналы выраслі слабей (732 супраць 528 і 340 супраць 278).[79] Каля 62 % красавіцкага PI (3 106 з 5 020 пунктаў, 208 паведамленняў) прыпадаюць на два дні — 15 красавіка, дзень падпісання закона, і 16 красавіка. Найбольшы ўнёсак сярод медыя зрабілі каналы SB.BY, Sputnik Беларусь, NEWS.BY, ONT NEWS і СТВ, сярод рэгіянальных — «Моцныя Навіны», Newgrodno.by і «Мінск. Галоўнае!», сярод дзяржаўных органаў — Савет Рэспублікі; з прапагандысцкіх каналаў у першую дзясятку ўвайшлі «ЖС Premium» і канал Азаронка.[80] У чэрвені паўторны рост забяспечылі Sputnik Беларусь, NEWS.BY і рэгіянальныя медыя пры захаванні фону «жоўтых» паблікаў.

[79] BLDPI, версія 2026.08.

[80] LGBTQ+ House, BLDPI: даныя на ўзроўні паведамленняў і каналаў (пашыраны набор, які не ўваходзіць у публічны дэпазіт; даступны па запыце office@lgbtqhouse.org); агрэгаваныя даныя па дзевяці катэгорыях — файл bldpi_monthly_by_category.csv у дэпазіце версіі 2026.08.

Пікі індэкса ў красавіку і чэрвені супалі з прыняццем закона і ўступленнем нормы ў сілу; у красавіку асабліва вырас унёсак каналаў дзяржаўных органаў і СМІ, паміж пікамі і пасля іх найбольшую долю індэкса складалі прапагандысцкія каналы. Гэта ўзгадняецца з гіпотэзай пра ўзмацненне інфармацыйнага суправаджэння заканадаўчых змен з боку дзяржаўных і медыйных каналаў. У ліпені ўнёсак катэгорыі СМІ знізіўся да 392 пунктаў, у жніўні — да 108, мінімальнага значэння шэрагу; месячныя агрэгаты не дазваляюць устанавіць прычыны дынамікі, ступень каардынацыі публікацый або яе сувязь з інтэнсіўнасцю правапрымянення. Даныя дапускаюць і завяршэнне інфармацыйнай кампаніі, і пазбяганне тэмы самімі рэдакцыямі, паколькі норма не ўтрымлівае выключэння для навіннага асвятлення; адрозніць гэтыя тлумачэнні па індэксе нельга (раздзел 7). Зніжэнне негатыўнага ўзважанага індэкса не азначае змяншэння ўсіх згадак ЛГБТК+ тэматыкі. PI вымярае інтэнсіўнасць і структуру дыскурсу ў рамцы назірання, а не колькасць пераследаў і не бяспеку людзей: зніжэнне PI не дазваляе судзіць пра змяненне колькасці зваротаў па дапамогу. Даныя TG House ахопліваюць некалькі месяцаў і не ўтвараюць супастаўнага памесячнага шэрагу.

4.3 Спадарожныя падзеі перыяду

Артыкул 24.62 дзейнічае з 19 чэрвеня. Рэжым экстрэмісцкіх матэрыялаў, праз які пераследуецца падпіска на ЛГБТК+ рэсурсы, працягваў пашырацца: у другім квартале 2026 г. спіс перавысіў 10 000 пазіцый[81], у чэрвені ў яго дададзена больш за 50 набораў Telegram-стыкераў, пералік МУС да 30 чэрвеня налічваў 373 пазіцыі.[82,83] Пастановай Савета Міністраў ад 1 чэрвеня 2026 г. № 274 зацверджана ў новай рэдакцыі палажэнне аб Нацыянальным савеце па гендарнай палітыцы; у палажэнні выкарыстоўваюцца паняцці «духоўна-маральных сямейных каштоўнасцей, мацярынства і бацькоўства» і не згадваюцца ЛГБТК+ людзі.[84]

4.4 Рэакцыя міжнародных механізмаў

Ліст шасці мандатаў ААН ад 3 снежня 2025 г. датычыўся праекта закона і ўтрымліваў тры пытанні да ўрада; станам на 21 верасня 2026 г. адказ Беларусі ў рэестры камунікацый не апублікаваны.[85] Заява сямі мандатаў ад 15 красавіка 2026 г. назвала прыняты закон «небяспечнай эскалацыяй» і запатрабавала «спыніць увядзенне закона ў дзеянне, адмяніць дыскрымінацыйныя палажэнні».[86] Даклад A/HRC/62/52: «становішча ЛГБТК+ людзей у Беларусі пагаршаецца … трансгендарныя людзі сутыкаюцца з дадатковымі бар'ерамі, асабліва ў доступе да аховы здароўя і юрыдычнага прызнання полу» (пункты 53–55); у вуснай заяве 29 чэрвеня 2026 г. ЛГБТК+ людзі названыя сярод груп, за кошт пераследу якіх колькасць палітычных зняволеных не змяншаецца.[87] Даклад Групы незалежных экспертаў ад 14 верасня 2026 г. аб сістэме крымінальнага правасуддзя становішча ЛГБТК+ людзей асобна не разглядае і ў пытанні турэмнай іерархіі адсылае да даклада A/HRC/61/57.[88] Заява ЕС на 62-й сесіі Савета па правах чалавека закон аб «прапагандзе» не называе.[89] У разгледжаных апублікаваных дакументах механізмаў ААН не выяўлена аналізу прымянення артыкула 19.16 пасля яго ўступлення ў сілу; матэрыялы, якія перадаюцца, могуць дапоўніць публічную доказную базу і звязаць паведамленні аб практыцы з ужо выказанымі прававымі ацэнкамі.

---

[81] Human Constanta, II кв. 2026.

[82] «Вясна», чэрвень 2026.

[83] МУС, пералік арганізацый і фарміраванняў.

[84] Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 1 чэрвеня 2026 г. № 274 (новая рэдакцыя Палажэння аб Нацыянальным савеце па гендарнай палітыцы); Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, https://www.mintrud.gov.by/special/ru/nacionalni_sovet_po_gendernoi_politike-ru.

[85] OL BLR 13/2025.

[86] УВКПЧ ААН, прэс-рэліз 15.04.2026.

[87] A/HRC/62/52.

[88] Савет ААН па правах чалавека, Удзел беларускіх дзяржаўных інстытутаў у парушэннях правоў чалавека ў працэсе крымінальнага правасуддзя: даклад Групы незалежных экспертаў, A/HRC/63/CRP.1, 14 верасня 2026 г., https://www.ohchr.org/sites/default/files/documents/hrbodies/hrcouncil/sessions-regular/session63/a-hrc-63-crp-1.pdf; вусная заява 18 верасня 2026 г.

[89] Еўрапейская служба знешніх сувязяў, HRC 62 — Заява EU — інтэрактыўны дыялог са Спецдакладчыкам па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, Жэнева, 29 чэрвеня 2026 г., https://www.eeas.europa.eu/delegations/un-geneva/hrc-62-eu-statement-interactive-dialogue-special-rapporteur-situation-human-rights-belarus_en.

5. Доступ да інфармацыі

Табліца 8. Каналы доступу да інфармацыі да і пасля 19 чэрвеня 2026 г.

Канал	Да 19.06.2026	Што дадаў артыкул 19.16	Што тэхнічна магчыма і з якой рызыкай	Крыніца / статус
Незалежныя медыя пра ЛГБТК+	рэсурсы TG House, DazHip, Prismatica ў спісе экстрэмісцкіх матэрыялаў; пераслед за падпіску	адказнасць за рэпост і перасылку любога матэрыялу, прызнанага «прапагандай»	чытанне без падпіскі праз VPN; рызыка пры праверцы прылады	Д1/Д2 · спісы — судовыя рашэнні; пераслед — паведамленні TG House
Кнігі	258 выданняў уключаны ў спіс, які абмяжоўвае іх распаўсюджванне	распаўсюджванне кнігі з «прывабным» адлюстраваннем ЛГБТК+ як магчымы склад	прыватнае чытанне; электронныя выданні па-за юрысдыкцыяй; рызыка пры праверцы прылады	Д1/Д3 · спіс Міністэрства інфармацыі; практыка — аналіз Human Constanta
Асабістыя акаўнты	доксінг, «пакаяльныя відэа», артыкул 343 за фатаграфіі	рызыка кваліфікацыі публікацый як распаўсюджвання інфармацыі з указанай у артыкуле мэтай	ананімныя акаўнты; выдаленне архіваў, рэкамендаванае БХК і TG House; рызыка не выключаецца	Д2, Д1, Р · практыка — TG House, A/HRC/59/59; кваліфікацыя — ацэнка БХК
Школы	артыкул 37-1 Закона «Аб правах дзіцяці» са студзеня 2026	рызыка прымянення часткі 2 пры азнаямленні непаўналетняга з інфармацыяй, якая адпавядае прыкметам артыкула	легальнага канала інфармацыі для падлеткаў у разгледжаных крыніцах не выяўлена	Р, Н · ацэнка рызыкі; выпадкаў не знойдзена
Медыцынская інфармацыя	паводле даных TG House, працэдуру суправаджае адзін упаўнаважаны ўрач; падрабязны алгарытм пераходу апублікаваны TG House, рэсурсам са спіса экстрэмісцкіх матэрыялаў	абмеркаванне працэдуры пераходу як «прапаганда змены полу»	прыём ва ўпаўнаважанага ўрача; замежныя кансультацыі даступныя дыстанцыйна, рызыкі залежаць ад статусу выкарыстоўванага рэсурсу, спосабу звароту і магчымасці доступу трэціх асоб да ўстройства	Д3, Н · працэдура — паведамленні TG House; прафілактыка ВІЧ — даных не знойдзена
Прававая інфармацыя	сайты БХК і Human Constanta і Telegram-канал «Прававая ініцыятыва» — у спісе экстрэмісцкіх матэрыялаў; БХК і Human Constanta — у пераліку экстрэмісцкіх фарміраванняў МУС	разбор нормы існуе; кантакт з аўтарам звязаны з прававой рызыкай	Legal Hub у ананімным фармаце звароту; апублікаванай практыкі абароны па норме не знойдзена	Д1/Д3 · спісы — афіцыйныя рашэнні; паслугі — паведамленні арганізацый
Культура	адмены фестываляў; спісы кніг	«карціны на выставах і тэатральныя перформансы» прама названыя БХК як ахопленыя нормай	мастацкае выказванне магчымае ў выгнанні (ілюстрацыя: выстава Prapahanda, Варшава, 12–21 жніўня 2026); даступнасці ўнутры краіны гэта не стварае[90]	Р, Д4 · ацэнка БХК; прыклад — ілюстрацыя
Камунікацыя супольнасці	чат знаёмстваў у спісе экстрэмісцкіх матэрыялаў; падстаўныя спатканні	рызыка прымянення часткі 1 да распаўсюджвання інфармацыі ў супольнасці	закрытыя групы па-за беларускімі платформамі; рызыка пры праверцы прылады	Д2 · паведамленні TG House

Крыніцы: табліца 5; БХК і Prismatica, 15.04.2026; TG House, маніторынг 2025; Human Constanta; Prapahanda.

Нароўні з абмежаваннямі, якія дзейнічалі раней, артыкул 19.16 уводзіць самастойную падставу адказнасці за распаўсюджванне інфармацыі з указанай у артыкуле мэтай, якая не патрабуе папярэдняга ўключэння матэрыялу або рэсурсу ў афіцыйны спіс. Для чалавека ўнутры краіны атрыманне інфармацыі пра сябе звязана з рызыкай пры праверцы прылады, а яе распаўсюджванне можа быць кваліфікавана як правапарушэнне паводле меркавання правапрымяняльніка.[91,92]

[90] Prapahanda, выстава, Nowe Miejsce, Варшава, 12–21 жніўня 2026 г., https://prapahanda.pl.

[91] Закон № 138-З.

[92] БХК і Prismatica, 15.04.2026.

6. Доступ да падтрымкі

6.1 Прававая дапамога

Паводле ацэнкі TG House у дакладзе да УПА 2025 г., ЛГБТК+ арганізацыі, якія раней дзейнічалі, ліквідаваныя, і спецыялізаваная прававая дапамога ўнутры краіны істотна абмежаваная.[93] Аналіз прынятай нормы Беларускім Хельсінкскім камітэтам і Prismatica пачынаецца з папярэджання: «сайт БХК прызнаны экстрэмісцкімі матэрыяламі, а сам БХК — экстрэмісцкім фарміраваннем. Прымайце меры засцярогі».[94] Агляд законаў і рызык апублікавала таксама Прававая ініцыятыва.[95] Ананімныя кансультацыі прапануе беларуская праваабарончая ініцыятыва Legal Hub; «Вясна» вядзе юрыдычную падтрымку з-за мяжы. З 2020 г. ліцэнзій пазбаўленыя не менш як 141 адвакат.[96] Апублікаванай практыкі абароны паводле артыкула 19.16 у разгледжаных крыніцах не выяўлена; абставінай, якая змякчае адказнасць, паводле артыкула 7.2 КаАП з'яўляецца «добраахвотнае спыненне супрацьпраўных паводзін», гэта значыць выдаленне інфармацыі. Пры гэтым юрыстка «Вясны» ўказвае на магчымасць запытаць копію пастановы ў органа, які яе вынес, і аднавіць тэрмін абскарджання, прапушчаны не па віне чалавека; прымяняльнасць і бяспека гэтых дзеянняў патрабуюць індывідуальнай юрыдычнай ацэнкі.[97] Міжнародныя індывідуальныя механізмы абмежаваныя: пасля дэнансацыі Першага факультатыўнага пратакола Камітэт па правах чалавека не прымае новых паведамленняў супраць Беларусі[98]; Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын застаецца кампетэнтным паводле Факультатыўнага пратакола 2004 г., але яго прадмет абмежаваны дыскрымінацыяй у дачыненні да жанчын: ён рэлевантны для лесбіянак, бісексуальных і трансгендарных жанчын і для нормы аб «прапагандзе бяздзетнасці». Беларусь не выконвае меркаванні камітэтаў.

6.2 Псіхалагічная дапамога

Эксперты ААН са спасылкай на арганізацыі грамадзянскай супольнасці фіксуюць рост зваротаў па псіхалагічную дапамогу.[99] У маніторынгу TG House апісаны пераслед псіхолага і актывісткі Марыны А., затрыманай КДБ 29 красавіка 2025 г.; яна скараціла практыку і з'ехала.[100] Паводле апытання TG House ад 21 лютага 2026 г., паводле інтэрпрэтацыі TG House, каля 80 % апытаных практыкуюць самацэнзуру з моманту, калі ўлады пачалі абмяркоўваць дыскрымінацыйныя законы, а 11 з 21 (52,4 %) ацэньваюць дзяржаўную палітыку як такую, што стварае пагрозлівую атмасферу (n = 21)[101]; паводле апытання ад 25 лютага 2026 г. (n = 21) толькі 6 з 21 (28,6 %) могуць жыць цалкам адкрыта.[102] Даных пра колькасць псіхолагаў, якія працуюць з ЛГБТК+ кліентамі, і пра ўплыў нормы на анлайн-кансультаванне няма. Маскоўскае даследаванне паказвае на магчымы механізм шкоды для псіхічнага здароўя[103]; беларускіх вымярэнняў знайсці не ўдалося.

6.3 Медыцынская дапамога трансгендарным людзям

Працэдура гендарнага пераходу законная і рэгулюецца пастановай Міністэрства аховы здароўя № 163 ад 9 снежня 2010 г. у рэдакцыі 2025 г.[104] Паводле тэксту пастановы медыцынскім паказаннем з'яўляецца дыягназ «Транссексуалізм» (F64.0); абследаванне праводзіцца на працягу года ў тры этапы ў замацаваных арганізацыях аховы здароўя; рашэнне выносіць міжведамасная камісія пры Мінздароўі, якая пасяджае не радзей за адзін раз на паўгоддзе; пастановай ад 10 верасня 2025 г. № 100 урач-сексолаг у камісіі і ў інструкцыі заменены ўрачом-псіхіятрам-нарколагам (у сіле з 18 верасня 2025 г.);

---

[93] TG House, даклад да УПА.

[94] БХК і Prismatica, 15.04.2026.

[95] Прававая ініцыятыва, «Становішча ЛГБТК+ у Беларусі ў 2026 годзе: законы, практыка, рызыкі», 1 ліпеня 2026 г., https://legin.info/posts/lgbt_belarus_2026.

[96] Кааліцыя беларускіх НДА, UPR-2025: Даклад Кааліцыі беларускіх НДА, красавік 2025 г., пункты 96–101, https://belhelcom.org/sites/default/files/upr-2025._report_of_the_coalition_of_belarusian_ngos._-_web_compressed.pdf.

[97] Еўрарадыё, 08.09.2026.

[98] A/79/201.

[99] УВКПЧ ААН, прэс-рэліз 15.04.2026.

[100] TG House, маніторынг 2025.

[101] TG House, «Маўчанне як стратэгія выжывання: як квір-людзі рэагуюць на анты-ЛГБТ-палітыку беларускіх уладаў», 21 лютага 2026 г., https://tbelarus.com/en/post/queer-peoples-reaction-to-anti-lgbt-policies.

[102] TG House, «“Хаваць сябе або з’язджаць”: з якімі выклікамі сутыкаюцца квір-людзі ў Беларусі», 25 лютага 2026 г. (n = 21), https://tbelarus.com/en/post/queer-safety-survey-2026.

[103] Hylton et al., 2017.

[104] Пастанова Мінздароўя № 163.

парадак абскарджання рашэнняў камісіі пастановай не ўстаноўлены.[105] На практыцы, паводле даных TG House, заяўнікі праходзяць два этапы камісіі: рашэнне аб змене дакументаў і допуск да медыцынскага пераходу.[106] Маніторынг TG House за 2019–2024 гг. паказвае долю адмоў па пасяджэннях у цэлым ад 0 да 41 % у 2019–2022 гг., 80 % у верасні 2023 г., 78 і 68 % у 2024 г.[107] Што да юрыдычнага прызнання полу, TG House паведамляе пра адмову 20 з 25 заяўнікаў у чэрвені 2025 г. (80 %), 20 з 28 у снежні 2025 г. (каля 71 %) і 19 з 29 у чэрвені 2026 г. (каля 66 %); на медыцынскім этапе адмовы атрымалі 2 з 5, 0 з 8 і 0 з 6 адпаведна.[108,109] Гэта звесткі маніторынгу аб канкрэтных пасяджэннях, а не афіцыйная статыстыка; больш нізкая доля адмоў у 2026 г. не азначае паляпшэння доступу, паколькі склад заяўнікаў і доступ да самога пасяджэння невядомыя. Міністэрства аховы здароўя адмовілася прадаставіць афіцыйную статыстыку як «службовую інфармацыю абмежаванага распаўсюджвання». TG House паведамляе пра непразрыстасць прыняцця рашэнняў, адсутнасць тлумачэнняў адмоў і эфектыўнага механізму абскарджання; працэдуру суправаджае адзін упаўнаважаны ўрач-псіхіятр-нарколаг у Мінску, і яго адсутнасць спыняе працэс «для сотняў трансгендарных людзей па ўсёй краіне».[110] Дзве незалежныя крыніцы называюць наступства: Кааліцыя фем-квір ініцыятыў гаворыць пра прымус «да небяспечнага самалячэння»[111]; «Салідарнасць» апісвае нелегальную гарманальную тэрапію і яе рызыкі.[112] Эксперты ААН адзначаюць, што закон «выклікаў у трансгендарных людзей асцярогі адносна доступу да лекаў».[113] Камітэт па правах чалавека яшчэ ў 2018 г. указаў Беларусі на лічбу полу ў ідэнтыфікацыйным нумары і катэгорыю 19a ў ваенных білетах[114]; TG House пасля гэтага дакументуе 12 выпадкаў ідэнтыфікацыі па пашпартнай лічбе і 5 выпадкаў катэгорыі 19a.[115] Артыкул 19.16 стварае дадатковую рызыку кваліфікацыі інфармацыі аб працэдуры як «прапаганды»: падрабязны рускамоўны алгарытм праходжання пераходу апублікаваны TG House, рэсурсам са спіса экстрэмісцкіх матэрыялаў.

6.4 Дапамога пры выездзе і міжнародная абарона

Выезд. Паводле даных TG House, у 2025 г. арганізацыя дапамагла выехаць 12 людзям, з пачатку 2026 г. па 15 жніўня — васьмі; з 24 тых, хто звярнуўся ў маі–жніўні 2026 г., да 8 верасня выехалі дзесяць.[116,117] Асноўная перашкода, паводле даных TG House: для гуманітарнай візы звычайна патрабуюцца дакументы аб пераследзе, а ўлады «ў многіх выпадках не выдаюць афіцыйных пастаноў або іншых дакументаў, якія пацвярджаюць факт пераследу»; віза патрэбная чалавеку да затрымання, а не пасля яго.[118]

Мяжа. З 27 сакавіка 2025 г. на польска-беларускай мяжы дзейнічае часовае абмежаванне права падаць заяву аб міжнароднай абароне паводле артыкула 33a Закона ад 13 чэрвеня 2003 г. аб прадастаўленні абароны іншаземцам; абмежаванне падаўжаецца пастановамі Савета міністраў, апошняя — ад 15 верасня 2026 г. на 60 дзён з 18 верасня.[119] Паводле часткі 2 артыкула 33b Памежная варта прымае заявы ад непаўналетніх без суправаджэння, цяжарных, асоб, якія патрабуюць асаблівага абыходжання з прычыны ўзросту або стану здароўя, асоб з адназначнымі прыкметамі рэальнай рызыкі сур'ёзнай шкоды ў дзяржаве, з якой чалавек непасрэдна прыбыў у Польшчу, і ад грамадзян дзяржавы, якая

[105] Пастанова Мінздараўя № 163.

[106] TG House, маніторынг 2025.

[107] TG House, Маніторынг працы камісіі па транс-пераходзе ў Беларусі (2019–2024), 18 снежня 2024 г., https://tbelarus.com/post/monitoring-komissii-po-trans-perehodu-v-belarusi-2019-2024; даныя 2025–2026 гг. паводле маніторынгу 2025 г. і агляду першага паўгоддзя 2026 г.

[108] TG House, маніторынг 2025, с. 14–15.

[109] TG House, агляд першага паўгоддзя 2026.

[110] TG House, маніторынг 2025.

[111] Coalition of Fem Queer Initiatives from Belarus, заява да прэсесіі УПА, 2025 г., https://upr-info.org/sites/default/files/country-document/2025-08/Belarus_Coalition_of_Fem_Queer_Initiatives_from_Belarus_statement.pdf.

[112] Салідарнасць, «Трансгендарная беларуска: “Людзі наважваюцца на нелегальную тэрапію, а так можна загубіць здароўе”», 4 лютага 2026 г., https://gazetaby.com/post/transgendernaya-belaruska-lyudi-reshayutsya-na-nelegalnuyu-terapiyu-a-/212219/.

[113] УВКПЧ ААН, прэс-рэліз 15.04.2026.

[114] CCPR/C/BLR/CO/5.

[115] TG House, даклад да УПА.

[116] Еўрарадыё, 15.08.2026.

[117] Еўрарадыё, 08.09.2026.

[118] TG House, маніторынг 2025.

[119] Закон ад 13 чэрвеня 2003 г. аб прадастаўленні замежнікам абароны на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, арт. 33a–33b, у рэдакцыі закона ад 21 лютага 2025 г.; Пастанова Rady Ministrów ад 27 сакавіка 2025 г. (Dz.U. 2025 poz. 390) і наступныя падаўжэнні, апошняе ад 15 верасня 2026 г. (Dz.U. 2026 poz. 1217); Urząd do Spraw Cudzoziemców, https://www.gov.pl/web/udsc/ograniczenie-prawa-do-zlozenia-wniosku-o-ochrone-miedzynarodowa.

ўжывае інструменталізацыю. Для грамадзян Беларусі прадугледжана выключэнне з абмежавання пры ўмовах пункта 5 часткі 2 артыкула 33b; частка 3 таго ж артыкула выключае яго прымяненне пры гвалтоўным перасячэнні мяжы ў групе і паводзінах, якія пацягнулі прымяненне мер прымусу; Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі Польшчы (MSWiA) у адказе амбудсменам ад 28 жніўня 2025 г. указвае, што кожны выпадак разглядаецца індывідуальна.[120] Даных пра тое, як выключэнне прымяняецца да грамадзян Беларусі на практыцы, не знойдзена; Упаўнаважаны па грамадзянскіх правах у маі 2026 г. выказаў занепакоенасць працягам дзеяння меры.[121]

Рашэнні ў Польшчы. Паводле ацэнкі Упраўлення па справах іншаземцаў, Польшча рэгіструе каля 90 % беларускіх заяў аб абароне, якія падаюцца ў Еўропе. З 2022 г. па 1 лютага 2026 г. ведамства вынесла грамадзянам Беларусі 11 680 рашэнняў, з іх 10 930 станоўчых (852 статусы бежанца і 10 078 дадатковых абарон), 343 адмоўныя і 407 рашэнняў аб спыненні вытворчасці; доля прызнання па рашэннях па сутнасці склала 99 % у 2022 г., 98 % у 2023 г., 94 % у 2024 г. і 94 % у 2025 г.; адмоўных рашэнняў было 29, 49, 153 і 112 адпаведна.[122] Даныя Eurostat па кварталах паказваюць пералом у другім квартале 2026 г. (табліца 9).[123] Даныя UdSC і Eurostat не супастаўныя наўпрост: першыя — назапашвальныя з 2022 г. і ўключаюць спыненыя вытворчасці, другія — квартальныя па рашэннях першай інстанцыі.

Табліца 9. Рашэнні першай інстанцыі па заявах грамадзян Беларусі аб міжнароднай абароне ў Польшчы, 2025-Q1 – 2026-Q2 (без спыненых спраў)

Квартал	Рашэнняў	Станоўчых	з іх статус бежанца	Адмоў	Доля адмоў
2025-Q1	560	525	65	35	6,3 %
2025-Q2	495	465	45	35	7,1 %
2025-Q3	310	280	25	30	9,7 %
2025-Q4	480	470	10	10	2,1 %
2026-Q1	380	370	30	10	2,6 %
2026-Q2	310	235	205	75	24,2 %

Крыніца: Eurostat, migr_asydcfstq (абнаўленне 16.09.2026); адзінка — асобы, ахопленыя рашэннямі; значэнні акруглены Eurostat да 5 незалежна адно ад аднаго, таму сума кампанентаў можа не супадаць з вынікам (напрыклад, 2025-Q2). Доля адмоў разлічана аўтарам як адмовы / рашэнні. Другі квартал 2026 г. прыпадае на перыяд пераходу на абноўленыя інструкцыі Eurostat па статыстыцы прытулку; з даступных метаданых не вынікае, што гэтым тлумачыцца змяненне польскіх паказчыкаў.[124]

Адначасова змянілася структура станоўчых рашэнняў: у другім квартале 2026 г. статус бежанца атрымалі 205 з 235 чалавек, тады як у папярэдніх кварталах статусаў было ад 10 да 65, а асноўную масу складала дадатковая абарона. Назапашвальныя справаздачы UdSC пацвярджаюць зрух: за студзень–май 2026 г. статус бежанца атрымалі 215 чалавек супраць 147 за ўвесь 2025 г.; тлумачэння ў апублікаваных матэрыялах не знойдзена. Месячныя значэнні атрыманы як рознасці назапашвальных справаздач Упраўлення станам на 1 чэрвеня, 1 ліпеня і 1 жніўня 2026 г. (разлік аўтара; паміж выпускамі магчымыя перагляды)[125]: у чэрвені 2026 г. — 52 адмовы, 21 статус бежанца, 4 дадатковыя абароны і 13 спыненых спраў, гэта значыць адмовы склалі 57,8 % усіх вынікаў (n = 90) і 67,5 % рашэнняў па сутнасці (n = 77); у ліпені — 82 адмовы, 10 статусаў бежанца, 4 дадатковыя абароны і 12 спыненняў, гэта значыць 85,4 % рашэнняў па сутнасці (n = 96); назапашаная доля прызнання за 2026 г. паводле справаздач UdSC знізілася з 95 % на 1 чэрвеня да 88 % на 1 ліпеня і 79 % на 1 жніўня. Тыя самыя чэрвеньскія лічбы

[120] Ministerstwo Spraw Wewnętrznych i Administracji, адказ на зварот Rzecznika Praw Obywatelskich i Rzecznika Praw Dziecka, BMP.0790.1.4.2025, 28 жніўня 2025 г., https://bip.brpo.gov.pl/sites/default/files/2025-08/Odpowiedz_MSWiA_granica_ochrona_miedzynarodowa_28_08_2025.pdf.

[121] Notes from Poland, «Упаўнаважаны па правах чалавека занепакоены тым, што польская “часовая” забарона на прытулак усё яшчэ дзейнічае праз год», 28 мая 2026 г., https://notesfrompoland.com/2026/05/28/human-rights-commissioner-concerned-that-polands-temporary-asylum-ban-still-in-place-one-year-on/.

[122] Urząd do Spraw Cudzoziemców, Raport na temat obywateli Białorusi (wg stanu na 1 lutego 2026 r.), https://www.gov.pl/attachment/4738d4ca-beae-459f-b0bb-2db8f2da7ac2.

[123] Eurostat, Рашэнні першай інстанцыі па заявах паводле тыпу рашэння, грамадзянства, узросту і полу — квартальныя даныя (migr_asydcfstq), Польшча, грамадзяне Беларусі, 2025-Q1 – 2026-Q2, даныя абноўлены 16 верасня 2026 г., https://ec.europa.eu/eurostat/databrowser/view/migr_asydcfstq.

[124] Eurostat, Asylum and managed migration — reference metadata (migr_asydec_esms), раздзел 15.2 аб пераходным перыядзе 2026 г., https://ec.europa.eu/eurostat/cache/metadata/en/migr_asydec_esms.htm.

[125] Urząd do Spraw Cudzoziemców, Справаздачы адносна грамадзян Беларусі (накапляльныя справаздачы па стане на 1 чэрвеня, 1 ліпеня і 1 жніўня 2026 г.), https://www.gov.pl/web/udsc/raporty-dotyczace-obywateli-bialorusi; справаздачы на 01.06.2026 https://www.gov.pl/attachment/be8fbc99-917f-4328-9efc-dbc67b8be152, на 01.07.2026 https://www.gov.pl/attachment/eea8fd87-82d0-47c5-82bb-09b04f8cbd24 і на 01.08.2026 https://www.gov.pl/attachment/7089372c-4050-4051-80ad-a7983a4353dc.

прыводзілі СМІ паводле даных Упраўлення.[126] Паводле паведамлення юрысткі Вольгі Дабравольскай, у краінавай інфармацыі, выкарыстанай у справе яе кліента, утрымлівалася ацэнка: «найбольшая хваля рэпрэсій прыпала на першыя гады пасля пратэстаў»; яна пярэчыць, што рэпрэсіўны механізм «працягвае працаваць, мяняюцца толькі яго формы», і называе ЛГБТК+ людзей сярод груп асаблівай рызыкі.[127]

Даследаванне не робіць высновы аб прычынах росту адмоў і аб тым, ці ўлічваецца артыкул 19.16 у канкрэтных справах: агрэгаваная статыстыка па грамадзянстве не змяшчае падстаў звароту, а рашэнні не апублікаваныя. Устаноўлена наступнае: рост долі адмоў прыпадае на другі квартал 2026 г.; апублікаванае ў ліпені паведамленне юрысткі аб ацэнцы рэпрэсій у адной справе не ўстанаўлівае дату змены агульнай краінавай ацэнкі UdSC і не тлумачыць дынаміку ўсіх рашэнняў; ніводная з даступных краінавых ацэнак, уключаючы справаздачу EUAA ад 12 мая 2026 г., якая вылучае ЛГБТК+ людзей як групу рызыкі і апісвае праверкі тэлефонаў пры вяртанні[128], не магла ўлічыць практыку прымянення прынятай нормы. Паводле апытання TG House сярод квір-мігрантаў у Польшчы, Літве, Францыі і Іспаніі (заяўлена 20 рэспандэнтаў; размеркаванне па краінах дае 21), адзін з апытаных у Польшчы апісвае даступнасць гарманальнай тэрапіі пры недаступнасці аперацый, не ўдакладняючы характар бар'ера.[129]

6.5 Падтрымка ў зняволенні

Група незалежных экспертаў ААН паводле ўласных інтэрв'ю: ЛГБТК+ зняволеныя змяшчаюцца ў катэгорыю «нізкага сацыяльнага статусу», «звычайна прызначаную для асуджаных за сексуальныя злачынствы», з прымусовай уборкай, ізаляцыяй і карцарам (пункт 30); сведкі паведамляюць пра абразлівыя і сексуалізаваныя каментары супрацоўнікаў калоній і КДБ (пункт 46).[130] У дакладзе 2025 г. эксперты апісалі збіццё трансгендарнай жанчыны супрацоўнікамі Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй (ГУБАЗіК) з ужываннем электрашокера і прымусам да «пакаяльнага відэа» (пункт 47).[131] Трансгендарныя жанчыны змяшчаюцца ў мужчынскія ўстановы.[132] Гэтыя даныя адносяцца да крымінальнага зняволення і следчых ізалятараў; даных пра ўмовы адміністрацыйнага арышту ЛГБТК+ людзей няма. Гэтыя звесткі важныя для ацэнкі рызыкі адміністрацыйнага арышту, прадугледжанага часткай 2 артыкула 19.16, аднак апісаныя ўмовы крымінальнага зняволення нельга аўтаматычна пераносіць на адміністрацыйнае ўтрыманне.

6.6 Розныя групы: што вядома і чаго няма

Норма пра «прапаганду бяздзетнасці» фармальна прымяняецца незалежна ад полу распаўсюджвальніка інфармацыі, але закранае абмеркаванне рэпрадуктыўнай аўтаноміі жанчын; гэты аспект разглядаецца ў камунікацыі мандатаў ААН, сярод падпісантаў якой — Рабочая група па дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын і дзяўчынак.[133] Кааліцыя фем-квір ініцыятыў паведамляе пра ціск органаў апекі на лесбіянак і бісексуальных жанчын з дзецьмі, пагрозы пазбаўлення бацькоўскіх правоў, абмежаванні рэпрадуктыўных паслуг для жаночых пар і сексуалізаваны гвалт пры затрыманнях[134]; колькасных даных няма. Па трансгендарных людзях даныя найбольш поўныя (раздзел 6.3). Для ацэнкі становішча непаўналетніх важныя рэкамендацыі Камітэта па правах дзіцяці 2020 г.; апытанне 21 трансгендарнага студэнта 2024 г. ахоплівае тых, хто вучыўся ў ВНУ і каледжах з 2012 г., і данымі пра падлеткаў не з'яўляецца[135]; даных пра ўплыў артыкулаў 37-1 і 19.16 на школы ў

[126] Еўрарадыё, «Польшча рэзка павялічвае колькасць адмоў у задавальненні хадайніцтваў беларусаў аб прытулку», 17 ліпеня 2026 г., паводле даных Упраўлення па справах іншаземцаў, https://euroradio.fm/en/poland-sharply-increases-rejections-asylum-claims-belarusians.

[127] Głos znad Niemna, «Польшча закрываецца ад уцекачоў з Беларусі», 18 ліпеня 2026 г., https://glosznadniemna.pl/73590/polska-zamyka-sie-na-uchodzcow-z-bialorusi/; Наша Ніва, «Беларусам усё часцей адмаўляюць у міжнароднай абароне ў Польшчы — што адбываецца», 30 ліпеня 2026 г., https://nashaniva.com/en/400851.

[128] EUAA, Беларусь: палітычная апазіцыя і іншадумства. Інфармацыйная справаздача пра краіну паходжання, 12 мая 2026 г., https://www.euaa.europa.eu/publications/coi-report-belarus-political-opposition-and-dissent.

[129] TG House, «Ад эвакуацыі да адаптацыі: з якімі рызыкамі сутыкаюцца квір-мігрант_кі ў ЕС», 5 лютага 2026 г. (20 рэспандэнтаў: Польшча 8, Літва 7, Францыя 5, Іспанія 1), https://tbelarus.com/en/post/from-evacuation-to-adaptation-queer-migrants-in-europe.

[130] A/HRC/61/57.

[131] Савет ААН па правах чалавека, Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі: даклад Групы незалежных экспертаў, A/HRC/58/68, 7 лютага 2025 г., пункты 38, 39, 47, 58, 59, 62, https://docs.un.org/en/A/HRC/58/68.

[132] Кааліцыя фем-квір-ініцыятыў, 2025.

[133] OL BLR 13/2025.

[134] Кааліцыя фем-квір-ініцыятыў, 2025.

[135] TG House, «Нябачныя шрамы: трансгендарныя студэнты пра булінг і дыскрымінацыю», 27 верасня 2024 г. (21 удзельнік, якія вучыліся ў ВНУ і каледжах Беларусі з 2012 г.), https://tbelarus.com/post/stud-opros-diskr-bulling.

разгледжаных крыніцах не знойдзена. Па людзях у выгнанні ёсць ацэнкі рызыкі экстэрытарыяльнага прымянення[136] і апытанне 20 мігрантаў; у разгледжаных крыніцах выпадкаў прымянення нормы да кантэнту эмігрантаў не знойдзена.

7. Што застаецца невядомым

Табліца 10. Прабелы ў даных, іх значэнне і суб'екты, здольныя іх закрыць

Прабел (Н)	Чаму важны	Хто можа закрыць
Колькасць пратаколаў, рашэнняў, штрафаў і арыштаў паводле артыкула 19.16 па частках артыкула	ключавы паказчык прымянення нароўні з выклікамі, пагрозамі і спыненымі справамі; цяпер тры выпадкі паводле даных адной арганізацыі	Беларусь (пытанне спецыяльных працэдур ААН); маніторынг судовых сайтаў
Крытэрыі «фарміравання ўяўленняў аб прывабнасці» ў практыцы	шырокі або вузкі сцэнар	аналіз першых пастаноў
Выбарковасць: ці распаўсюджваюць дзяржаўныя медыя інфармацыю, якая ад прыватных асоб кваліфікавалася б паводле артыкула 19.16	прыкмета дыскрымінацыйнага прымянення	Беларусь; BLDPI паводле катэгорый
Прычыны зніжэння ўкладу катэгорыі CMI ў PI у ліпені–жніўні 2026 г.; магчымыя тлумачэнні ўключаюць змяненне рэдакцыйнага парадку дня і стрымальны эфект нормы	паказвае, ці распаўсюджваецца стрымальны эфект нормы на рэдакцыі	кантэнт-аналіз каналаў катэгорыі CMI; BLDPI па катэгорыях
Блакіроўкі і выдаленні са спасылкай на артыкул 19.16	ніводнага выпадку не знойдзена; справаздачы платформаў не дазваляюць вылучыць Беларусь і артыкул	Міністэрства інфармацыі; платформы
Адмены культурных мерапрыемстваў са спасылкай на закон	мандат Спецдакладчыка па культурных правах	Беларуская Рада культуры; PEN Belarus
Прафілактыка ВІЧ сярод МСМ і трансгендарных людзей	даступныя аналізы ECOM апісваюць становішча да артыкула 19.16	ECOM; ЮНЭЙДС; САА3
Псіхалагічная дапамога ўнутры краіны	рэальная даступнасць	прафесійныя супольнасці ў выгнанні
Школы і педагогі: рэакцыя на артыкулы 37-1 і 19.16	ацэнкі крыніц паказваюць на рызыку; пацверджаных выпадкаў прымянення нормаў да педагогаў у разгледжаных матэрыялах не знойдзена	апытанні педагогаў у выгнанні
Лесбіянкі і бісексуальныя жанчыны: маштаб ціску органаў апекі	заяўлена, не вымерана	Кааліцыя фем-квір ініцыятыў; Рабочая група ААН
Прымяненне выключэння артыкула 33b часткі 2 пункта 5 да грамадзян Беларусі на мяжы	рэальная даступнасць працэдуры	Памежная стража; Упаўнаважаны па грамадзянскіх правах
Прычыны змены структуры станоўчых рашэнняў у дачыненні да беларусаў у Польшчы ў 2026 г.	зрух пацверджаны справаздачамі UdSC (215 статусаў бежанца за студзень–май 2026 г. супраць 147 за 2025 г.); прычыны не апублікаваныя	Упраўленне па справах іншаземцаў; аналіз рашэнняў
Рашэнні па заявах аб абароне па прыкмеце сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці (СОГІ) у Польшчы, Літве, Германіі	ці ўлічваецца новая падстава	ведамствы па запыце; EUAA

Крыніца: складзена аўтарам.

Даследаванне Еўразійскай кааліцыі па здароўі, правах, гендарнай і сексуальнай разнастайнасці (ECOM) 2017 г. і наступныя рэгіянальныя агляды апісваюць больш раннія прававыя бар'еры для прафілактыкі ВІЧ сярод ЛГБТ у Беларусі; іх высновы неабходна абнавіць з улікам артыкула 19.16 і стану паслуг у 2026 г.[137]

[136] Прававая ініцыятыва, 01.07.2026.

[137] ECOM — Еўразійская кааліцыя па здароўі, правах, гендарнай і сексуальнай разнастайнасці, Заканадаўчы аналіз, звязаны з правамі ЛГБТ і ВІЧ у Беларусі, Талін, 2017 г., https://ecom.ngo/en/library/legislative-analysis-belarus-en/; ECOM, рэгіянальны агляд за 2019 г., 2020 г., https://ecom.ngo/wp-content/uploads/2020/03/ECOM_regional_2019_en.pdf.

8. Рэкамендацыі

Патрабаванні да Рэспублікі Беларусь як асноўнага носьбіта абавязацельстваў сфармуляваныя механізмамі ААН і ва УПА і тут не дублююцца: адмена дыскрымінацыйных абмежаванняў, спыненне пераследу за правамернае выказванне, забеспячэнне доступу да інфармацыі і дапамогі. Рэкамендацыі ніжэй адрасаваныя суб'ектам трэціх краін, міжнародным механізмам і арганізацыям у межах іх кампетэнцыі і сфармуляваныя як меры зніжэння рызыкі; ніводная з іх не гарантуе бяспекі. Кожная прывязаная да канкрэтнай прагаліны ў раздзелах 4–7.

8.1 Арганізацыям дапамогі

1. Арганізаваць кансультаванне ўнутры краіны так, каб зніжаць рызыку ідэнтыфікацыі карыстальніка: платформы па-за беларускай юрысдыкцыяй, без падпіскі, з інструкцыямі па выдаленні слядоў звароту з прылады карыстальніка; ні платформа, ні VPN, ні выдаленне перапіскі не з'яўляюцца дастатковымі прыкметамі бяспекі. Падстава: пераслед за падпіскі паводле артыкула 19.11; маніторынг сацыяльных сетак і праверка прылад як спосабы ідэнтыфікацыі.
2. Весці ўзгоднены рэестр выпадкаў прымянення артыкула 19.16 паводле агульнага пратакола арганізацый, што дакументуюць: дата, рэгіён, орган, частка артыкула, мера, наяўнасць пратакола, спосаб ідэнтыфікацыі; з мінімізацыяй даных, што збіраюцца, абмежаваным доступам і згодай чалавека на перадачу звестак трэцім асобам. Публікаваць штоквартальна ў агрэгаваным выглядзе без даных, якія дазваляюць ідэнтыфікаваць асоб.
3. Забяспечваць доступ да праверанай медыцынскай інфармацыі пра пераход і да індывідуальных кансультацый з удзелам медыцынскіх спецыялістаў, выбіраючы спосабы распаўсюджвання з улікам рызык ідэнтыфікацыі і патрэб карыстальнікаў, а не скарачаючы публічную інфармацыю як такую. Падстава: ацэнка рызыкі кваліфікацыі публічных інструкцый па гендарным пераходзе як «прапаганды», паведамленні пра самалячэнне.
4. Увесці стандарт фіксацыі доказаў пры першым звароце для будучых заяў аб міжнароднай абароне: скрыншоты, выклікі, паказанні сведкаў, з захоўваннем копій у арганізацыі за межамі Беларусі са згоды чалавека; спосаб захоўвання і абыходжанне са слядамі на прыладзе вызначаюцца індывідуальнай ацэнкай бяспекі з улікам захаванасці доказаў і рызык доступу да іх. Адсутнасць афіцыйнага дакумента не азначае адсутнасці абгрунтаванага страху пераследу. Падстава: афіцыйныя дакументы былі ў шасці з 24 асоб, якія звярнуліся; Кіраўнічыя прынцыпы УВКБ № 9 і практыка, абагульненая EUAA.
5. Польскім арганізацыям: уключыць беларускіх ЛГБТК+ заяўнікаў у праграмы прававой дапамогі пры абскарджанні рашэнняў Упраўлення ў Раду па справах бежанцаў (Rada do Spraw Uchodźców) і далей у Ваяводскі адміністрацыйны суд у Варшаве. Падстава: рост адмоў у другім квартале 2026 г.

8.2 Інстытуцыям Польшчы

1. Упраўленню па справах іншаземцаў: абнавіць краінавую ацэнку па Беларусі з улікам артыкула 19.16, раздзела J даклада A/HRC/62/52, справаздачы EUAA ад 12 мая 2026 г. і Fact Sheet EUAA/2026/47; разглядаць сексуальную арыентацыю і гендарную ідэнтычнасць як самастойную падставу рызыкі ў адпаведнасці з рашэннямі Суда ЕС па справах X, Y і Z (C-199/12–C-201/12) і A, B і C (C-148/13–C-150/13).
2. Упраўленню і Міністэрству ўнутраных спраў і адміністрацыі: паведаміць, ці фіксуецца падстава пераследу ва ўліку рашэнняў, і публікаваць статыстыку рашэнняў па грамадзянах Беларусі з разбіўкай па падставах у агрэгаванай форме, якая выключае ідэнтыфікацыю малых груп, з апісаннем якасці класіфікацыі.
3. Міністэрству замежных спраў і консульствам: разглядаць выдачу гуманітарнай візы пры дакументаванай рызыцы да затрымання, прымаючы сведчанні арганізацый дапамогі як доказ пры адсутнасці афіцыйных дакументаў.
4. Упаўнаважанаму па грамадзянскіх правах і Памежнай стражы: растлумачыць і адсочваць прымяненне выключэння артыкула 33b часткі 2 пункта 5 да грамадзян Беларусі, уключаючы ЛГБТК+ заяўнікаў.

5. Дэпутатам і Камісіі па замежных справах Сейма: запытаць у Міністэрства замежных спраў, ці ўздымалася пытанне аб артыкуле 19.16 у двухбаковых і шматбаковых фарматах; запытаць у Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі статыстыку рашэнняў па грамадзянах Беларусі з разбіўкай па падставах перасleду.

8.3 Інстытуцыям Еўрапейскага саюза

1. Еўрапейскай службе знешніх сувязяў: назваць артыкул 19.16 і яго прымяненне ў заявах ЕС на 63-й і 64-й сесіях Савета па правах чалавека, абапіраючыся на рашэнне па справе C-769/22 як на пазіцыю ЕС па законах гэтага тыпу.
2. EUAA: выпусціць абнаўленне краінавай інфармацыі аб становішчы ЛГБТК+ людзей у Беларусі пасля 19 чэрвеня 2026 г.
3. Еўрапейскаму парламенту: запытаць у Камісіі, як артыкул 19.16 улічаны ў Стратэгіі роўнасці ЛГБТІК на 2026–2030 гг. і ў праграмах падтрымкі беларускага грамадзянскага грамадства.

8.4 Міжнародным механізмам ААН

1. Спецыяльным працэдурам: накіраваць ураду Беларусі камунікацыю аб прымяненні прынятай нормы з удзелам Спецдакладчыка па культурных правах, з пытаннямі аб колькасці пратаколаў па частках артыкула, крытэрыях «прывабнасці», выбарачнасці прымянення, блакіроўках, адменах мерапрыемстваў, суадносінах з пастановай № 24 і прадастаўленні адказу на пытанні OL BLR 13/2025, паколькі на дату пошуку адказ у адкрытым рэестры не апублікаваны.
2. Спецдакладчыку па Беларусі: уключыць правапрымяненне артыкула 19.16 у даклады да 82-й сесіі Генеральнай Асамблеі і да 65-й сесіі Савета па правах чалавека.[138] Групе незалежных экспертаў: працягнуць аналіз становішча ЛГБТК+ людзей у дакладзе да 64-й сесіі Савета, дапоўніўшы высновы A/HRC/61/57 звесткамі аб прымяненні артыкула 19.16.
3. Дагаворным органам: пры наступным разглядзе Беларусі запытаць выкананне рэкамендацый CCPR/C/BLR/CO/5 (пункты 19–20), CRC/C/BLR/CO/5-6 (пункты 15, 21, 34) і CEDAW/C/BLR/CO/9 (пункт 30) у святле артыкула 19.16; пры разглядзе наступнага перыядычнага даклада Беларусі ў Камітэце па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын прадставіць матэрыялы аб прымяненні нормы аб «прапагандзе бяздзетнасці» і аб становішчы лесбіянак, бісексуальных і трансгендарных жанчын, без прадвызначэння дапушчальнасці індывідуальных скаргаў.

8.5 Платформам

1. Meta, TikTok, Google, Telegram: улічыць, што публічная актыўнасць беларускіх карыстальнікаў выкарыстоўваецца для ідэнтыфікацыі паводле артыкула 19.16, і даць беларускім ЛГБТК+ арганізацыям канал паскоранай рэакцыі на доксінг і «пакаяльныя відэа», якія публікуюцца праўладнымі каналамі.

8.6 Донарам і даследчыкам

1. Фінансаваць збор даных, якіх не хапае, пералічаных у раздзеле 7, у наступным парадку прыярытэту: рэестр прымянення нормы; прымяненне выключэння на мяжы; прафілактыка ВІЧ; псіхалагічная дапамога; рашэнні па заявах аб абароне па прыкмеце сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці ў краінах ЕС. Выкарыстоўваць метады з папярэдняй ацэнкай бяспекі ўдзельнікаў, мінімізацыяй персанальных даных і выключэннем кантактаў, якія ствараюць непрымальную рызыку.
2. Размяшчаць у адкрытых рэпазіторыях даследаванні і бяспечныя агрэгаваныя даныя з пастаяннымі ідэнтыфікатарамі; звесткі пра канкрэтных людзей перадаваць міжнародным

[138] Савет ААН па правах чалавека, рэзалюцыя 61/26 «Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі», прынятая 30 сакавіка 2026 г., A/HRC/RES/61/26, пункты 7–8 (даклады Спецдакладчыка 65-й сесіі Савета і 82-й сесіі Генеральнай Асамблеі; вусны даклад Групы незалежных экспертаў на 63-й і поўны даклад на 64-й сесіі), https://docs.un.org/en/A/HRC/RES/61/26; гл. вынікі 61-й сесіі, https://www.ungeneva.org/en/news-media/meeting-summary/2026/03/le-conseil-des-droits-de-lhomme-acheve-les-travaux-de-sa-61eme.

механізмам асобна, з улікам згоды, канфідэнцыйнасці і ўмоў прымаючага механізму, у тым ліку Групе незалежных экспертаў у межах дзейнага запрашэння.[139]

Дадатак А. Храналогія

Табліца 11. Храналогія, сакавік 2024 г. – верасень 2026 г.

Дата	Падзея
19.03.2024	Пастанова Мінкультуры № 24 адносіць «нетрадыцыйныя палавыя адносіны і (або) палавыя паводзіны» да «сексуальных вычварэнняў» (апублікавана 11.04.2024, у сіле з 12.04.2024)
28.03.2024	Першае ўключэнне рэсурсаў ЛГБТК+ ініцыятывы ў Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў (табліца 5)
21.11.2024	Першы спіс забароненых друкаваных выданняў (35 найменняў)
07.02.2025	Першае чытанне паправак да Закона «Аб правах дзіцяці»
09.07.2025	Праект закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай адказнасці» унесены Саветам Міністраў у Палату прадстаўнікоў
11.07.2025	Заява беларускіх праваабарончых арганізацый супраць праекта[140]
12.07.2025	Закон № 86-З аб правах дзяцей падпісаны
кастрычнік 2025	Першае чытанне праекта паправак да заканадаўства аб адміністрацыйнай адказнасці
03.11.2025	Агляд Беларусі ў межах УПА, 50-я сесія
03.12.2025	Ліст шасці мандатаў ААН OL BLR 13/2025
08.01.2026	Беларусь адхіляе ўсе рэкамендацыі УПА па сексуальнай арыентацыі і гендарнай ідэнтычнасці (A/HRC/61/4/Add.1)
13.03.2026	Прыняцце закона Палатай прадстаўнікоў у другім чытанні
02.04.2026	Адабрэнне Саветам Рэспублікі
15.04.2026	Падпісанне закона; заява сямі мандатаў ААН; аналіз нормы БХК і Prismatica
21.04.2026	Рашэнне Суда ЕС па справе C-769/22
12.05.2026	Справаздача EUAA аб Беларусі
19.05.2026	Даклад Спецдакладчыка A/HRC/62/52
19.06.2026	Уступленне артыкула 19.16 у сілу
25.06.2026	Паводле сведчання Геры — выклік на допыт «за прапаганду»; гісторыя апублікаваная 29.08.2026, артыкул, паводле якога вялася справа, не ўказаны
29.06.2026	Прадстаўленне даклада Спецдакладчыка на 62-й сесіі Савета
15.08.2026	Першае публічнае паведамленне TG House пра задакументаваны пераслед паводле артыкула 19.16 (Еўрарадыё)
08.09.2026	TG House паведамляе пра тры задакументаваныя ёю выпадкі паводле артыкула 19.16
14.09.2026	Даклад Групы незалежных экспертаў A/HRC/63/CRP.1
27.09.2026	Сто дзён дзеяння нормы

Крыніца: складзена аўтарам паводле крыніц раздзелаў 2–4.

Дадатак Б. Пратакол пошуку і аб’ём праверкі

Базы і сайты. Сістэма афіцыйнай дакументацыі ААН паводле сімвалаў A/HRC, A/79, CCPR, CRC, CEDAW; база камунікацый спецыяльных працэдур; старонкі мандатаў Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека (УВКПЧ) па Беларусі; UPR Info; HUDOC; CURIA; база судовай практыкі EUAA; Eurostat; gov.pl; bip.brpo.gov.pl; pravo.by; сайты TG House, Prismatica, Lawtrend, Беларускага Хельсінкскага камітэта, Human Constanta, Прававой ініцыятывы, «Вясны», ILGA-Europe, TGEU, Human Rights Watch, Amnesty International, Freedom House, EUAA, ECOM; справаздачы аб празрыстасці Meta.

[139] УВКПЧ ААН, Заклік да падачы інфармацыі ў Групу незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі: апошні дзень прыёму матэрыялаў 30 лістапада 2026 г., https://www.ohchr.org/en/hr-bodies/hrc/gie-belarus/index/call-submitting-information-group-independent-experts-human-rights-situation-belarus (дата звароту: 22.09.2026).

[140] Заява арганізацый беларускай праваабарончай супольнасці аб недапушчальнасці крыміналізацыі свабоды выказвання і дыскрымінацыі ЛГБТК+ людзей, 11 ліпеня 2025 г., https://www.lawtrend.org/social-actions/zayavlenie-organizatsij-belarusskogo-pravozashhitnogo-soobshhestva-o-nedopustimosti-kriminalizatsii-svobody-vyrazheniya-i-diskriminatsii-lgbtk-lyudej.

Стратэгія пошуку. Дакументы ААН шукалі паводле сімвалаў у Сістэме афіцыйнай дакументацыі і паводле мандатаў у базе камунікацый спецыяльных працэдур; судовую практыку — па нумарах спраў у HUDOC, CURIA і базе судовай практыкі EUAA; беларускія акты — па рэквізітах на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале; афіцыйныя пералікі — на сайтах Міністэрства інфармацыі і МУС; статыстыку — па кодах табліц Eurostat і выпусках справаздач UdSC. На сайтах пералічаных арганізацый адбіраліся публікацыі за 2024–2026 гг., якія датычацца пытанняў даследавання. Дадаткова ажыццяўляўся поўнатэкставы пошук на рускай, беларускай, англійскай і польскай мовах па пяці тэматычных блоках: норма і заканадаўчы працэс; правапрымяненне і выпадкі; афіцыйныя спісы і абмежаванні; медыцынская працэдура і здароўе; міжнародная абарона і мяжа. **Перыяд.** Дакументы пра падзеі з 1 студзеня 2024 г. па 21 верасня 2026 г. (дата апошняга пошуку); базавыя прававыя акты, міжнародныя стандарты, судовая практыка і ранейшыя даследаванні ўключаліся незалежна ад даты. Шэраг BLDPI па 31 жніўня 2026 г.; датаваныя звесткі пра правапрымяненне ў межах гэтага перыяду, недатаваныя паведамленні прыведзены асобна.

Крытэрыі ўключэння. Першасныя дакументы; публікацыі арганізацый з апісанай метадалогіяй або верыфікацыяй выпадкаў; афіцыйная статыстыка; СМІ як носьбіты першасных даных або прамых цытат з указаннем крыніцы даных. **Крытэрыі выключэння.** Пераказы аднаго маніторынгу ў іншых публікацыях як самастойныя крыніцы; матэрыялы без даты; ананімныя Telegram-каналы як крыніца фактаў. **Аб’ём праверкі.** Па поўным тэксце праверaны: Закон № 138-З (артыкулы 1 і 4), A/HRC/61/4 і Add.1, A/HRC/62/52, A/HRC/61/57, A/HRC/59/59, A/HRC/58/68, A/79/201, CCPR/C/BLR/CO/5, CRC/C/BLR/CO/5-6, CEDAW/C/BLR/CO/9, OL BLR 13/2025, прэс-рэліз № 59/26 Суда ЕС, інфармацыйная даведка EUAA/2026/47, справаздачы UdSC, выгрузка Eurostat, маніторынг Lawtrend за красавік 2026 г., маніторынг TG House за 2025 г. і агляд першага паўгоддзя 2026 г., разбор БХК і Prismatica, даклады TG House і кааліцыі НДА да УПА; даклад A/HRC/63/CRP.1 і заява ЕС ад 29.06.2026 вывучаны цалкам на прадмет згадванняў ЛГБТК+ тэматыкі. Публікацыі СМІ праверaны па ўказаных у іх першасных даных; цытаты зверaны з арыгіналам, пераклады пазначаны. Шэраг BLDPI зверaны з апублікаванымі файламі версіі 2026.08.

Як цытаваць

LGBTQ+ House (2026). Доступ да інфармацыі і падтрымкі ва ўмовах артыкула 19.16 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях: задакументаваныя абмежаванні, прабелы ў дапамозе і рэкамендацыі для арганізацый і інстытуцый. Варшава, верасень 2026 г., версія 1.5. Шэраг BLDPI па 31 жніўня 2026 г.; пошук дакументаў завершаны 21 верасня 2026 г. https://lgbtqhouse.org/article-19-16/research. DOI https://doi.org/10.5281/zenodo.22884584. Ліцэнзія CC BY 4.0. Набор даных: BLDPI 2026.08, https://doi.org/10.5281/zenodo.22876522.